Віват Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту!

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»

27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

Са 100-годдзем БДУ!

Дарагая мая ўніверсітэцкая сям'я!
Я віншую ўсіх нас, універсітэт са значнай датай –100-годдзем.
Гэтая дата непарыўна пераплецена з развіццём
і станаўленнем усёй сістэмы айчыннай адукацыі і навукі!

100-годдзе БДУ – свята многіх беларусаў. Бо векавая гісторыя найстарэйшай ВНУ ў рознай ступені так ці інакш закранула шмат якія сем'і, звязала лёсы многіх людзей, краін і нацый.

БДУ – магутнае векавое дрэва, якое дало краіне больш за 185000 выпускнікоў, вялікую колькасць навуковых адкрыццяў, плеяду самых аўтарытэтных навукоўцаў. І такім яно стала дзякуючы ўнікальным асобам, заснавальнікам і сучаснікам БДУ, якія на працягу стагоддзя ствараліі ствараюць гісторыю БДУ.

Унікальнасць універсітэта ў яго арыгінальнай формуле, дзе спалучаюцца традыцыі і навацыі, вопыт і маладосць, адзінства і рознасць, а самае галоўнае – неабыякавае стаўленне да БДУ яго шматтысячнага калектыву. У гэтым сіла нашай карпарацыі, яе глыбінныя сэнсы і ўніверсітэцкая спадчына.

Ва ўніверсітэце няма выпадковых людзей. Усе мы розныя, унікальныя і асаблівыя. Але ўсіх нас аб'ядноўвае агульная ідэя – праца на карысць БДУ і нашай Беларусі.

Я ўдзячны кожнаму выкладчыку, навукоўцу, супрацоўніку, студэнту за асабісты ўнёсак у развіццё БДУ, за годнае прадстаўленне ўніверсітэта ў яго 100-годдзе, за традыцыі, дасягненні і за новыя магчымасці. Не бойцеся выходзіць з зоны камфорту, без гэтага немагчыма ніякае развіццё, заўсёды шукайце і не страчвайце сябе, і праз гэты шлях знаходзьце агульныя карані з БДУ.

Любіце і памятайце час, праведзены ў сценах універсітэта! Я спадзяюся, што ў наступныя стагоддзі і тысячагоддзі БДУ будзе заставацца для многіх такой жа глыбокай цэласнасцю, каштоўнасцю і гонарам, а мы – яго сучаснікі і будучыя пакаленні – заўсёды з цеплынёй і падзякай будзем шанаваць БДУ!

З юбілеем, БДУ, са святам, дарагі ўніверсітэт!

Рэктар БДУ
прафесар Андрэй КАРОЛЬ

БДУ – быць заўжды № 1!

Напярэдадні 100-годдзя БДУ рэктар Андрэй КАРОЛЬ даў інтэрв'ю БелТА. Нагода вельмі значная. Падзея занесена ў спіс памятных дат ЮНЕСКА, адзначаецца на высокім рэспубліканскім узроўні. Да 100-годдзя ўніверсітэта датычны практычна кожны ў нашай краіне. Бо за векавую гісторыю БДУ падрыхтаваў звыш 185 000 спецыялістаў, 4700 кандыдатаў навук, 700 дактароў навук, больш за 15 000 замежных спецыялістаў, магістрантаў, аспірантаў. У ліку выпускнікоў – вядомыя навукоўцы, акадэмікі, прафесары, лаўрэаты дзяржаўных прэмій СССР, БССР і Беларусі, менеджары вышэйшага звяна буйных кампаній. Са сцен БДУ выйшлі народныя паэты, заслужаныя дзеячы, прызёры Алімпійскіх гульняў. Пра гістарычнае і сучаснае прызначэнне першага, найстарэйшага і вядучага ўніверсітэта Беларусі чытайце ў нашым матэрыяле.

Трэба надаць БДУ рысы ўніверсітэта XXI стагоддзя, прывесці ў адпаведнасць змест і форму праз выкарыстанне каласальнага інтэлектуальнага і навуковага патэнцыялу

– Андрэй Дзмітрыевіч, 100-годдзе БДУ – эпахальная падзея для ўсёй універсітэцкай супольнасці і для краіны ў цэлым. Як ахарактарызуеце ролю БДУ ў развіцці беларускага грамадства на розных этапах?

– З БДУ пачынаецца гісторыя вышэйшай адукацыі Беларусі, гісторыя навуковых школ і сама падрыхтоўка спецыялістаў. Калі 1 студзеня 1919 года была абвешчана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь, практычна адначасова вышэйшым заканадаўчым органам новай краіны было прынята рашэнне пра выданне дэкрэта ад 25 лютага 1919 года пра стварэнне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэты факт паказвае на першасновы беларускай дзяржаўнасці і гістарычнае прызначэнне БДУ. Яго адмысловая місія заключалася ў фарміраванні сістэмы адукацыі і навукі. Далейшыя падзеі паказалі пастаянасць у яе рэалізацыі. Прыгадаем 1922 год. Многія супрацоўнікі ўніверсітэта склалі кадравае ядро Інстытута беларускай культуры, які ў 1929 годзе быў ператорваны ў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі. У 1926 годзе на базе нашай бібліятэкі створана Нацыянальная бібліятэка, вядомая ў свой час «ленінка». Вяртаючыся да 30-х гадоў, можам убачыць, што БДУ стаў асновай для Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і іншых.

За першыя 10 гадоў свайго існавання БДУ стаў базай для стварэння 12 ВНУ і шэрагу НДІ.

– Якое ўспрыманне БДУ было ў Вас у першыя месяцы працы, і ці памнянялася яно праз час?

– Першае ўражанне звязана з людзьмі, якія працуюць у БДУ.

Я звярнуў увагу на іх карпаратыўнасць і накіраванасць на самаддачу ўніверсітэту. Праз гады я толькі ўмацаваўся ў меркаванні пра неабыякавасць і адданасць калектыву сваёй справе.

Вядома, у мяне былі асцярогі, як людзі прымуць новага кіраўніка. Але сутыкнуўся з вялікімі чаканнямі дынамічных змен і развіцця ВНУ. Пра гэтага мне гаварылі і дэканы, і выкладчыкі на нашых сустрэчах, з якіх і пачаліся мае першыя рэктарскія крокі ў БДУ. Людзі хацелі працаваць на карысць універсітэта. Важна было іх уключыць у працэс планавання і руху ВНУ. Для гэтага прыйшлося звярнуцца да арганізацыйна-дзейнаснага прыёму, які я часта выкарыстоўваю на занятках са студэнтамі – далучыць іх да вытворчасці свайго прадукту. Падраздзяленням загадзя разаслалі анкеты рэфлексіўнага тыпу для прапаноў па развіцці БДУ. У выніку мы мелі інфармацыю, новыя ідэі і думкі, выявілі «болевыя» кропкі падраздзялення. Адначасова з гэтым ключавыя ўпраўленні падрыхтавалі мне інфармацыю аб'ектыўнага характару.

Сустрэчы мелі не столькі дыягнастычныя (убачыць праблемы падраздзяленняў), колькі стваральныя мэты.

Непасрэдна ад людзей я чуў пра справы і праблемы. Плюс прапанавалі свае рашэнні. Атрымаўся канструктыўны калектыўны дыялог.

– Да якіх высноў Вы тады прыйшлі па выніках шматлікіх сустрэч з калектывамі?

– БДУ мне здаўся вялікім, універсальным і шматфункцыянальным караблём. Такім своеасаблівым фрэгатам, які ціха стаіць у гавані, унутры якога неабыякавыя людзі, патрыёты ВНУ. Але пры гэтым у мяне не было адчування адзінай каманды: выкладчыкі на адным узроўні палубы, студэнты – на іншым, кіраўніцтва і адміністрацыя – на трэцім. Гэта ўсяго толькі вынік маіх аналітычных разваг і эмацыйных адчуванняў.

Сваю задачу бачыў у аб'яднанні гэтага карабля ў адзіны дынамічны экіпаж, каб ВНУ мэтанакіравана рухалася далей. Трэба было надаць БДУ рысы ўніверсітэта XXI стагоддзя, прывесці ў адпаведнасць змест і форму праз выкарыстанне каласальнага інтэлектуальнага і навуковага патэнцыялу.

Важнае разуменне супрацоўнікамі прапанаваных рашэнняў, а таксама іх абмеркаванне. Патрэбна адкрытасць.

Тэорыя і практыка сёння такія, што прадукт стварэцца і жыве, калі ён расце з каранёў. Другі крок маёй адміністрацыйнай працы заключаўся ў рашэнні публічнага абмеркавання дасланых ідэй на ўсіх адміністрацыйных узроўнях: кафедральным, факультэцкім і савеце. Мы планамерна ўкаранілі тыя інструменты і механізмы, якія дапамаглі караблю стаць сучасным.

– Што Вы маеце на ўвазе?

– Гэта рэйтынгавая ацэнка прадукцыйнасці працы з прывязкай да матэрыяльнага стымулявання.

У нас 30 % выкладчыкаў атрымліваюць штомесячную дадатковую прэмію па выніках рэйтынгу.

У залежнасці ад індывідуальных паказчыкаў сума выплат складае ад 56 да 319 бел. рублёў з пазабюджэтных сродкаў універсітэта. У выніку гэта дало магчымасць скаардынаваць розных людзей на дасягненне агульных мэт універсітэта. У нас выраслі колькасць публікацый у міжнародных часопісах, колькасць ступененых, заработная плата.

Прадукцыйнасць працы ў мінулым годзе ўзрасла на 18 %, пры гэтым каэфіцыент росту прадукцыйнасці працы да росту заработнай платы ўпершыню стаў большы за 1.

Гэта значыць, што кожны на сваім працоўным месцы паказвае лепшыя вынікі, стаў больш матываваны.

Актывізавалася мабільнасць, за апошнія чатыры гады мы павялічылі колькасць адукацыйных праграм на англійскай мове амаль у шэсць разоў.

Сёння ва ўніверсітэце дзейнічаюць 23 праграмы на англійскай мове: 18 на другой ступені і 5 па першай. А ў 2017 г. іх было ўсяго чатыры. За гэтым стаіць велізарная праца нашых супрацоўнікаў, якая прывяла да павелічэння колькасці замежнікаў у БДУ і, я ўпэўнены, заклала добры падмурак на будучыню.

Рост прадукцыйнасці працы прывёў да росту прыбыткаў, таму мы пачалі актыўна ўкладвацца ў будаўніцтва.

Дарэчы, за два апошнія гады на матчастку выдаткавана ў пяць разоў больш, чым у 2014—2017 гадах.

Ужо цяпер відаць, як змяніўся ўніверсітэт. Адрамантаваны будынак PIKK, фасады ў інтэрнатах, НДІ ЯП і ФРФіКТ.

Зроблены комплексны рамонт факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі, праведзена рэканструкцыя ўнікальнага і адзінага ў Беларусі ўніверсітэцкага музея землязнаўства.

Завяршаецца рамонт другой чаргі галоўнага корпуса, абноўлены ўніверсітэцкі дворык. У лістападзе–снежні пачнём капітальны рамонт будынка гісторыкаў. Канцэпцыя прадугледжвае стварэнне ў іх корпусе факультэта-музея. Сёлета плануем увесці ў карыстанне корпус на вул. Даўгабродскай. Гэта палепшыць умовы для навучання філолагаў, эканамістаў і эколагаў.

Павялічваецца спартыўная база. Летась прынялі на баланс корпус на вул. Адоеўскага, дзе цяпер ідуць заняткі па фізкультуры ў спецмедгруп, горад перадаў нам стадыён на вул. Панамарэнкі.

А калі зазірнуць на пяць гадоў наперад, то іх БДУ плануе правесці ў вялікай будоўлі.

У 2024 г. пачнём капрамонт трэцяй і чацвёртай чэргаў галоўнага корпуса, хочам пабудаваць фізкультурна-аздараўленчы комплекс на вул. Курчатава, за кошт крэдыту Сусветнага банка капіталізацыі і ўкамплектуем сучасным абсталяваннем міждысцыплінарны цэнтр для прыродазнаўчых факультэтаў на вул. Курчатава, 7. У планах узвядзенне паміж хімфакам і юрфакам навучальнага корпуса, дзе будзе знаходзіцца інавацыйны міжнародны цэнтр адукацыі БДУ.

Але разумеем, што і гэтыя пяць гадоў не дазволяць вырашыць усе пытанні матэрыяльнай базы.

– З першых крокаў Вы агучылі шэраг амбіцыйных задач для БДУ, у тым ліку ўваходжанне ВНУ ў 1 % найлепшых універсітэтаў свету. Якія патрэбныя рэсурсы, каб рухацца далей?

– У юбілейны год мы дасягнулі гэтай мэты, увайшлі ў топ-300 найлепшых ВНУ свету паводле сусветных рэйтынгаў.

Тут важна разумець, што сярод ВНУ ў 1 % пачынаецца вельмі жорсткая канкурэнцыя.

Не з усімі ВНУ топ-300 у фінансавым плане мы можам канкураваць. На іх прасоўванне ў рэйтынгах укладваюць дзясяткі мільярдаў долараў.

Але ўдзельнічаць у рэйтынгах важна. Рэйтынгі – бізнес і палітыка, сістэма адліку, дзе цябе ацэньваюць іншыя. Гэта аб'ектыўная рэальнасць. Хочам мы ці не, але нам даводзіцца гуляць па такіх правілах, ад увагі да рэйтынгаў залежаць экспарт і эканоміка краін. Гэта замежныя студэнты і інвестыцыі ў нашу.

Мы можам прасоўвацца за кошт інтэлектуальнага патэнцыялу БДУ. Гэта якасць навуковых даследаванняў і колькасць навуковых артыкулаў у часопісах сусветнага ўзроўню, павелічэнне цытаванасці прац нашых навукоўцаў. Для паляпшэння дадзеных паказчыкаў мы распрацавалі сістэму стымулявання публікацыйнай актыўнасці навукоўцаў.

Напрыклад, у 2018–2020 гадах колькасць публікацый БДУ, праінДэксаваных у Scopus, выраслa на 17 % у параўнанні з перыядам 2015–2017.

– З Вамі звязана ўкараненне эўрыстычных метадаў у навучанне. Наколькі гэты падыход зацікавіў выкладчыкаў?

Сёння сучасны выкладчык не можа займаць пазіцыю пасіўнага транслятара правільнай і гатовай інфармацыі, якая заўсёды ўспрымаецца як усеагульная і нічыйная.

Веды ўнутры кожнага з нас. Важна, каб выкладчык быў не «давальнікам» у сучасным і змяняльным свеце, а стаў арганізатарам даследаванняў, эўрыстычнай, творчай дзейнасці студэнта, выходзячы з яго досведу, ведаў і бачання свету. Праз стварэнне адукацыйных прадуктаў у выглядзе матэрыялізаваных рэчаў і ўнутраных змен якасцяў студэнта мы раскрываем яго патэнцыял і адкрываем яго самому сабе. Такая ідэя закладзена ў адукацыі эўрыстычнага тыпу. Яна мае ўсе атрыбуты сістэмы навучання: сэнсы, мэты, змест, формы, метады, крытэрыі ацэнкі заснаваны на тым, што студэнт не атрымлівае гатовыя веды, а стварае свой унікальны адукацыйны прадукт. Гэты падыход вучыць ставіць мэты, пытанні, параўноўваць «сваё» і «чужое», дазваляе пазбегнуць шаблоннасці, руйнуе «фабрыку падрыхтоўкі» стэрэатыпнага, экіпіраванага толькі інфармацыяй спецыяліста. Але для гэтага выкладчык павінен валодаць эўрыстычнымі якасцямі па індывідуалізацыі і раскрыцці патэнцыялу студэнта. Педагог сам павінен пражыць ролю «стваральніка», а не слухача. Таму мы рэгулярна праводзім семінары па фарміраванні такіх кампетэнцый у выкладчыка. Калі ён сам пройдзе шлях «творцы», адчуе свае ўнутраныя змены, тады зможа раскрыць і студэнта.

Семінары спрыяюць і фарміраванню метадычнай базы. Падчас іх правядзення выкладчыкі стварыюць свой кантэнт, навучальныя дапаможнікі, распрацоўваюць планы заняткаў, фонд ацэначных сродкаў.

У выніку ў нас больш за 1500 новых адукацыйных праграм з інавацыйнымі падыходамі і метадамі выкладання навучальных дысцыплін. Банк аўтарскіх метадычных распрацовак эўрыстычнага тыпу ўключае больш за 15 тысяч заданняў і звыш 500 аўтарскіх метадычных распрацовак.

Пакуль яшчэ ў малой ступені, але набірае абароты выдавецкая дзейнасць. Выходзіць новая навучальна-метадычная літаратура, у ліку якой серыя «Крэатыўная адукацыя», практыкумы адкрытых (эўрыстычных) заданняў для гуманітарных і прыродазнаўчых дысцыплін, навучальныя выданні і дапаможнікі. Гэта значыць, што сістэма крэатыўнай адукацыі ў БДУ працуе. Варта назваць яшчэ міжуніверсітэцкі адукацыйны партал «Метадалогія, змест, практыка крэатыўнай адукацыі» і «Педагагічную майстэрню анлайн-навучання». Дарэчы, апошні праект стаў вынікам аператыўнага рэагавання на новыя ўмовы і рэальнасць, выкліканыя пандэміяй.

Запатрабаванасць крэатыўнай сістэмы пацвярджаецца цікавасцю не толькі аўтарытэтных СМІ да эўрыстычнага навучання, але і працадаўцаў. Для мяне гэта пэўнага роду індыкатар якасці.

– Апрача высокіх пазіцый БДУ ў міжнародных рэйтынгах, у чым выяўляецца яго вядучая роля ў маштабах краіны?

– Сучасны БДУ – гэта інавацыйны ўніверсітэт з перадавымі тэхналогіямі і методыкамі навучання. Галоўным дасягненнем БДУ за векавую гісторыю з'яўляецца ўздым вышэйшай адукацыі Беларусі на якасна новы ўзровень.

Пра гэта гавораць шматлікія факты.

У нас навучаецца кожны трэці студэнт з рэспубліканскага банка даных адораных моладзі, кожная 5-я кандыдацкая і 6-я дактарская дысертацыі ў рэспубліцы на рахунку нашых навукоўцаў.

Дарэчы, за апошнія пяць гадоў мы на 30 % павялічылі колькасць абарон дактарскіх дысертацый. Штогод навукоўцы БДУ ўваходзяць у лік самых цытаваных аўтараў у галіне прыродазнаўчых і гуманітарных ведаў і публікуюць каля 800 артыкулаў у аўтарытэтных сусветных часопісах.

Наш універсітэт – лідар у Беларусі па колькасці апублікаваных навуковых прац у міжнародных часопісах, якія індэксуюцца ў базе даных Web of Science.

Дзякуючы вышэйпералічаным дзеянням мы здолелі зрабіць эксцапанентны скачок у экспарце адукацыйных паслуг. Упершыню ў БДУ навучаецца звыш 4000 замежных студэнтаў больш чым з 60 краін, што з'яўляецца самым высокім паказчыкам у Беларусі. Яшчэ тры гады таму гэта лічба вагалася ў межах дзвюх з паловай тысяч.

БДУ займае асаблівае месца ў сістэме навуковых арганізацый Беларусі. Найбольш прыярытэтнымі напрамкамі нашых навуковых даследаванняў з'яўляюцца фарміцэўтыка, хімія, біялогія, радыёэлектроніка, ветэрынарыя, вялікая ўвага надаецца развіццю касмічных даследаванняў. Дарэчы, БДУ стаў першай і пакуль адзінай установай вышэйшай адукацыі, дзе студэнты і супрацоўнікі ФРФіКТ стварылі ўніверсітэцкі нанаспадарожнік BSUSat-1. Ён паспяхова запушчаны 29 кастрычніка 2018 года.

У наш час у БДУ створаны BSUSat-2. Яго запуск запланаваны на 2022 год.

Распрацоўкі навукоўцаў БДУ шырока выкарыстоўваюцца ў розных сферах дзейнасці – ад аэракасмічнай да сельскай гаспадаркі. Каманда НДІ ядзерных праблем БДУ адзіная з СНД увайшла ў найбуйнейшы еўрапейскі мегапраект Graphene Flagship. У складзе калабарацыі CMS і ATLAS навукоўцы БДУ зрабілі важны ўнёсак у адкрыццё базона Хігса на Вялікім адронным калайдары ў CERN. Суаўтарамі публікацый пра новую часціцу з'яўляюцца 15 супрацоўнікаў НДІ ЯП.

У БДУ створаны ўсе ўмовы для развіцця навуковых і творчых інтарэсаў студэнта. Адкрыты і развіваецца навукова-тэхналагічны парк «Унітэхпрам», дзе навукоўцы, аспіранты, студэнты рэалізоўваюць свае бізнес-ініцыятывы, навуковыя ідэі і прапановы. Ва ўніверсітэце функцыянуюць 133 творчыя клубы, штогод праводзіцца больш за 600 культурна-масавых мерапрыемстваў. 70 студэнтаў БДУ ўваходзяць у склады нацыянальных зборных каманд Рэспублікі Беларусь і з'яўляюцца членамі клубаў па 20 відах спорту. Створана жаночая каманда па баскетболе «БДУ-Цмокі».

– Чым характэрнае, на Ваш погляд, цяперашняе пакаленне студэнтаў, чаго ад іх чакаеце?

– Рэальнасць сучаснага свету – яго шабланізацыя. Чалавек часцяком бярэ звесткі толькі з інтэрнэт-рэсурсаў ці СМІ. У студэнтаў выпрацоўваецца разуменне, што праўда знаходзіцца ў першых радках пошукавых сістэм Facebook, Google, Telegram. Гэта спараджае пэўную сацыяльную небяспеку, стварае ілюзорнасць свету і рызыкі маніпулявання свядомасцю.

Культурна-гістарычная спадчына, мысленне чалавека, па меркаванні навукоўцаў, падобнае да цэласнага тэксту, у якім ёсць разгорнуты сюжэт і прычынна-выніковыя сувязі.

Апошнія 50 гадоў мы назіраем, як тэкст актыўна ператвараецца ў гіпертэкст. Тым самым мы бачым распад цэласнага на мноства дробных складнікаў, якія ніяк не звязаны адзін з адным. І каласальная небяспека ў тым, што гэты гіпертэкст адлюстроўвае свядомасць сучаснага чалавека. Прыкладам служыць сетка Інтэрнэт. Тут адсутнічае іерархія каштоўнасцяў і матывацыя, але ёсць маніпуляцыя. І ў гэтай зоне рызыкі, вядома, сёння знаходзіцца наша моладзь. Часта яна ўспрымае свет як нейкую камп'ютарную гульню, што фарміруе непрадбачэнне ўяўленне пра жыццё і патрабаванне «тут і цяпер». Пры гэтым нам трэба разумець, што не студэнты жывуць у наш час, а мы жывём у іх час, бачачы рызыкі ўплыву тэхналагічных і інфармацыйных працэсаў.

Важна вучыць студэнтаў адрозніваць маніпуляцыі, інфармацыйныя і іншыя тэхналогіі па ўздзеянні на свядомасць ад праўды.

Але разам з тым сярод нашых студэнтаў вельмі шмат яркіх, своеасаблівых і матываваных асоб. Сёння моладзь больш разняволеная, крэатыўная, творчая, ініцыятыўная. Яна розная. І трэба кожнаму даць магчымасць пры гэтай розначасі сябе правявіць, інакш яго актыўнасць і матывацыя загасне. Таму мы прапануем удзел у працы ў розных студэнцкіх і добраахвотніцкіх арганізацыях з улікам іх запытаў, праводзім стартапы, патрыятычныя, культурна-асветніцкія і спартыўныя мерапрыемствы. Далучаем моладзь да кіраўнічых працэсаў БДУ.

Сёння 25 % членаў Савета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прадстаўлена студэнцтвам. Праз такую пазіцыю можна дасягаць і навучальных, і выхавацўчых мэт.

Універсітэт – асяроддзе, дзе адбываецца станаўленне асобы, выхаванне яе патрыятычных якасцяў. У зносінах са студэнтамі мы прытрымліваемся партнёрска-настаўніцкіх, гарызантальных, а не кіраўнічых адносін. У гэтым вялікі сэнс, бо такі падыход уцягвае іх у моладзева-студэнцкі рух, раскрывае іх і тым самым дапамагае рэалізавацца. Калі студэнт адчувае сваю запатрабаванасць і самадастатковасць, ён становіцца патрыётам альма-матар і краіны.

Спадзяюся, што кожны з нашых студэнтаў зможа ў БДУ знайсці сябе, стане пасяховым і з падзякай будзе ўзгадваць універсітэт і годна прадстаўляць яго на жыцці.

– Неяк у Вас нашы калегі-журналісты пацікавіліся, што б Вы спыталі ў першага рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты, калі б атрымалася з ім сустрэцца. Вы адказалі, што хацелі б ведаць, якім ён бачыць БДУ праз 100 гадоў. А што Вы пажадалі б рэктару і студэнтам 2121 года?

– Для мяне БДУ – магутны жывы арганізм, з унікальнай каранёвай сістэмай, якая напаўняе энергіяй, сілай, ведамі кожнага. Для захавання яшчэ працягнуць развіццё імунную сістэму арганізма сваёй неабыякавасцю і захаванне традыцый, але і заўсёды глядзець наперад, ставячы новыя мэты. Іншымі словамі, не ісці, а нават бегчы, каб не адставаць ад іншых і рухацца ў гэтым напрамку, часам змяняючы гэтыя традыцыі на новыя. Бо БДУ не застыла, а жывы арганізм. Я пажадаў бы свайму калегу і студэнтам 2121 года, ды і ўсім нам – сведкам векавога юбілею БДУ, адданасці абранай прафесіі і традыцыям нароўні з пошукам новых мэт, пастаяннага здабыцця сябе, і не баяцца выйсці з зоны камфорту, без чаго немагчымае развіццё. Заўсёды шукаць і не спрачацца сябе, і праз гэты шлях знаходзіць агульныя карані з універсітэтам 2021 года.

Паводле матэрыялу БелТА

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

БДУ сёння – гэта інавацыйны ўніверсітэт з перадавымі тэхналогіямі і методыкамі навучання, шматтысячная карпарацыя прафесіяналаў, аўтарытэтных навукоўцаў і найлепшых выкладчыкаў

КОМПЛЕКС БДУ

31 факультэт, навучальны інстытут і адукацыйная ўстанова

177 кафедраў

1 стартап-цэнтр

6 музеяў

2 навуковыя цэнтры

3 вучэбна-вопытныя станцыі

НАВУЧАННЕ

I ступень вышэйшай адукацыі — **83** спецыяльнасці

II ступень вышэйшай адукацыі — **46** спецыяльнасцяў

II ступень вышэйшай адукацыі — **120** профіляў

II ступень вышэйшай адукацыі — **31** профіль для замежных грамадзян (навучанне на замежнай мове)

аспірантура — **132** спецыяльнасці і галіны навук

дактарантура — **121** спецыяльнасць і галіна навук

МІЖНАРОДНЫ АЎТАРЫТЭТ

БДУ ўвайшоў у лік топавых універсітэтаў – 1 % найлепшых ВНУ свету (293-е месца па версіі кансалтынгавага агенцтва QS)

СУСВЕТНЫЯ АДКРЫЦЦІ

15 навукоўцаў БДУ сталі суаўтарамі першых публікацый, якія паведамляюць аб адкрыцці базона Хігса ў CERN

ДЫСТАНЦЫЙНАЕ НАВУЧАННЕ

У БДУ функцыянуе самы буйны ў краіне Адукацыйны партал з выкарыстаннем электронных сродкаў навучання (ён абслугоўвае 7800 навучальных дысцыплін з колькасцю карыстальнікаў 25 тысяч чалавек)

ПРЭСТЫЖНЫЯ ПУБЛІКАЦЫІ

Наш універсітэт – лідар у Беларусі па колькасці апублікаваных навуковых прац у міжнародных часопісах базы даных Web of Science (штогод каля 800 артыкулаў у аўтарытэтных сусветных часопісах)



ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ

БДУ адзіны з беларускіх ВНУ запусціў на арбіту Зямлі ўласны нанаспадарожнік, створаны студэнтамі і выкладчыкамі! Ужо тры гады ўсе яго бартавыя сістэмы спраўна функцыянуюць, а цяпер рыхтуецца да запуску другі касмічны апарат

ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКІ ІНКУБАТАР

Стартап-цэнтр БДУ дапамагае рэалізоўваць інавацыйныя ідэі ў паспяховы камерцыйны прадукт

САМЫ БУЙНЫ РЭПАЗІТОРЫЙ

Электронная бібліятэка БДУ займае 2-е месца ў свеце сярод універсітэцкіх лічбавых сховішчаў

ПЛЕЯДА АСПІРАНТАЎ

БДУ – найбуйнейшая ў Беларусі ўстанова пасляўніверсітэцкай адукацыі – тут навучаецца кожны пяты аспірант краіны. У БДУ аспірантаў у разы больш, чым у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

ЛІЧБАВЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

У БДУ паспяхова рэалізуецца канцэпцыя лічбавага ўніверсітэта, якая ўключае комплекс мерапрыемстваў, накіраваных як на мадэрнізацыю зместу, формаў і метадаў навучання, так і на развіццё інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры БДУ

НАЙЛЕПШЫЯ НАВУКОЎЦЫ

Кожная 5-я беларуская кандыдацкая і 6-я доктарская на рахунку нашых навукоўцаў

ТАЛЕНАВІТЫЯ СТУДЭНТЫ

У нас навучаецца кожны трэці студэнт з рэспубліканскага банка даных адоранай моладзі

АКАДЭМІЧНАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ

3500+ выкладчыкаў

210+ дактароў навук і прафесараў

1000+ кандыдатаў навук

8 акадэмікаў НАН Беларусі

11 членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі

НАВУКА

6 навукова-даследчых інстытутаў

42 навукова-даследчыя лабараторыі пры факультэтах

8 інавацыйна-вытворчых прадпрыемстваў

46 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый

1 навуковы тэхнапарк (у ім **9** прадпрыемстваў-рэзідэнтаў)

МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

550+ пагадненняў аб супрацоўніцтве з замежнымі ўніверсітэтамі, навуковымі і камерцыйнымі арганізацыямі з **59** краін

4 000+ замежных студэнтаў з **61** краіны

185 000+ выпускнікоў, з іх **15 000+** замежных выпускнікоў

30+ ганаровых прафесараў БДУ (вядомых замежных навукоўцаў і палітыкаў)

100+ міжнародных навуковых і навукова-практычных мерапрыемстваў (канферэнцый, семінараў і г. д.) штогод

ІНФРАСТРУКТУРА БДУ

Агульная плошча будынкаў **439 853,70** м²

2 млн тамоў – фонд Фундаментальнай бібліятэкі БДУ

18 навучальных карпусоў

9 інтэрнатаў для студэнтаў (пражывае амаль **8000** студэнтаў)

1 інтэрнат для супрацоўнікаў

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

Факультэты & інстытуты

У структуру БДУ ўваходзяць больш за дваццаць навучальных устаноў.

Біялагічны факультэт

1931 г. **Адзін з найбуйнейшых адукацыйных, навуковых і экспертных цэнтраў па біялогіі, біятэхналогіі, біяінжынерыі і біяінфарматыцы ва Усходняй Еўропе.**

1900 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Біялогія (па напрамках)», «Біяэкалогія», «Біяхімія», «Мікрабіялогія».

Цэнтр біяэквівалентных выпрабаванняў лекавых прэпаратаў, вытворчасці рэкамбінатных інтэрферонаў і мікробных біярэгулятараў росту раслін. Заалагічны музей, батанічны сад, гербарый, Нарачанская біялагічная станцыя імя Г. Г. Вінберга.

Ваенны факультэт

2003 г. **Рыхтуе кадравых афіцэраў на найвышэйшым узроўні. Адзін з найлепшых факультэтаў па падрыхтоўцы ваенных кадраў у Рэспубліцы Беларусь.**

150 курсантаў. Спецыяльнасці: «Хімія», «Праваznаўства», «Прыкладная інфарматыка», «Геаінфармацыйныя сістэмы», «Прыкладная крыптаграфія», «Міжнародныя адносіны».

Выпускнікоў ваеннага факультэта БДУ чакаюць пярвічныя пасады афіцэрскага складу ў сілавых структурах забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Гістарычны факультэт

1934 г. **Гістарычны факультэт БДУ – адзіны навукова-адукацыйны цэнтр у Беларусі, дзе прадстаўлены ўвесь спектр даследаванняў у галіне гістарычных навук.**

860 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Гісторыя (па напрамках)», «Гісторыка-архівазнаўства», «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны», «Дакументазнаўства», «Рэгіёназнаўства».

Гістарычны факультэт – гэта традыцыі і навацыі, рамантыка археалагічных раскопак і этнаграфічных экспедыцый. Яго нумізматычны кабінет – адзіны сярод універсітэцкіх збораў у СНД і адзін з найбагацейшых у Еўропе.

Механіка-матэматычны факультэт

1958 г. **Адзіны факультэт у краіне, які ажыццяўляе падрыхтоўку ў галіне фундаментальнай матэматыкі і навучае матэматыкаў для міждысцыплінарных галін.**

1090 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Механіка і матэматычнае мадэляванне», «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі (па напрамках)», «Камп'ютарная матэматыка і сістэмны аналіз», «Матэматыка».

Факультэт працуе ў цесным супрацоўніцтве з навукова-даследчымі інстытутамі НАН Беларусі, а таксама са шматлікімі вытворчымі прадпрыемствамі і IT-кампаніямі.

Факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі

1934 г. **Галоўны адукацыйны, навуковы і экспертны цэнтр па геаграфіі ў Беларусі. Адзіны ў краіне вядзе падрыхтоўку спецыялістаў у галіне геаінфарматыкі, космааэракартаграфіі і гідраметэаралогіі. Найбуйнейшы цэнтр па навучанні геолагаў, географаў і геаэколагаў.**

589 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Геаінфармацыйныя тэхналогіі», «Гідраметэаралогія», «Геаграфія», «Геаэкалогія», «Космааэракартаграфія», «Геалогія і разведка радовішчаў карысных выкапняў».

Унікальны музей землязнаўства – адзіны ў краіне прыродазнаўчы музей такога профілю. Аранжарэя, навучальная геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна».

Факультэт журналістыкі

1944 г. **Факультэт журналістыкі – вядучы ў Беларусі цэнтр журналісцкай адукацыі і даследаванняў СМІ, які рыхтуе прафесіяналаў для ўсіх сектараў сучаснай медыяіндустрыі.**

1060 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Журналістыка (па напрамках)», «Журналістыка міжнародная», «Інфармацыя і камунікацыя», «Літаратурная работа».

Журфак дае магчымасць праз штодзённую практыку набыць запатрабаваную прафесію, атрымаўшы ўнікальную творчую спецыялізацыю – рэпарцёра, палітычнага аглядальніка, арт-журналіста, фотакарэспандэнта і шмат іншых.

Факультэт міжнародных адносін

1995 г. **ФМА з'яўляецца вядучым навучальна-навуковым цэнтрам па падрыхтоўцы спецыялістаў у сферы міжнародных адносін, міжнароднага права, адзіны ў Беларусі ажыццяўляе падрыхтоўку па лінгвакраіназнаўстве, мае значны патэнцыял у сферы сусветнай эканомікі, міжнароднага турызму і мытнай справы.**

Каля 2000 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Міжнародныя адносіны, «Міжнароднае права», «Сусветная эканоміка», «Менеджмент», «Мытная справа», «Лінгвакраіназнаўства».

Навучальны корпус ФМА – візітоўка сталіцы. Студэнты вывучаюць дзве замежныя мовы з 18, што выкладаюцца на факультэце.

Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі

1971 г. **Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі – гэта вядомы ў Рэспубліцы Беларусь і замежных краінах брэнд, які рыхтуе прафесіяналаў для ўсіх сектараў сучаснай IT-сферы.**

1375 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Прыкладная матэматыка», «Інфарматыка», «Эканамічная кібернетыка», «Актуарная матэматыка», «Камп'ютарная бяспека», «Прыкладная інфарматыка».

На базе ФПМІ штогод праводзяцца спаборніцтвы каманднага чэмпіянату свету (ICPC Belarus and Baltics Regional Contest). Студэнты БДУ рэгулярна выступаюць у фінале ў ліку 100 найлепшых каманд свету.

Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій

1976 г. **Адзіны ў Беларусі фізіка-тэхнічны факультэт, які рыхтуе спецыялістаў міждысцыплінарнага профілю для галін фізікі, радыёэлектронікі, тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій.**

900 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Радыёфізіка», «Фізічная электроніка», «Камп'ютарная бяспека», «Аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі», «Прыкладная інфарматыка».

Студэнты, магістранты і аспіранты бралі ўдзел у распрацоўцы нанаспадарожніка, які запушчаны на калязямную арбіту ў 2018 г. Плануецца запуск другога навукова-адукацыйнага спадарожніка, які валодае большым функцыяналам для правядзення космафізічных эксперыментаў.

Факультэт сацыякультурных камунікацый

2004 г. **Міждысцыплінарны экспертны цэнтр у галіне дызайну, вэб-дызайну, міжкультурных камунікацый, тэорыі і практыкі перакладу, выкладання сучасных замежных моў.**

1200 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Дызайн (камунікатыўны)», «Дызайн (прадметна-прасторавага асяроддзя)», «Прыкладная інфарматыка», «Культуралогія», «Сучасныя замежныя мовы (пераклад)», «Сучасныя замежныя мовы (выкладанне)».

На факультэце 5 моўных кафедраў, якія забяспечваюць выкладанне замежных моў і на іншых факультэтах БДУ. Дзейнасць кафедры экалогіі чалавека (наксалагічныя дысцыпліны) таксама мае агульнаўніверсітэцкі характар.

Факультэт філасофіі і сацыяльных навук

1999 г. **ФФСН з'яўляецца адным з вядучых цэнтраў падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй сацыяльна-гуманітарнага профілю.**

1500 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Філасофія», «Сацыялогія», «Псіхалогія», «Сацыяльныя камунікацыі», «Сацыяльная работа».

ФФСН – факультэт, які фарміруе сэнсы. Ён ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў у галіне філасофіі і ў сферы сацыяльных камунікацый, адзіны ў БДУ, які аб'ядноўвае псіхалагаў розных напрамкаў.

Фізічны факультэт

1958 г. **Фізічны факультэт забяспечвае высокі ўзровень адукацыі ў галіне фізіка-матэматычных навук з улікам сучасных тэндэнцый развіцця навукі і тэхнікі, патрабаванняў прамысловасці і бізнесу.**

685 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Фізіка (па напрамках)», «Фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій», «Ядзерныя фізіка і тэхналогіі», «Камп'ютарная фізіка».

Навучальна-навуковы цэнтр па нанаматэрыялах і нанатэхналогіях, астранамічная лабараторыя, цэнтр калектыўнага карыстання ўнікальным навуковым абсталяваннем.

Філалагічны факультэт

1939 г. **Філалагічны факультэт – гэта alma mater класікаў беларускай літаратуры; цэнтр беларусістыкі, русістыкі, славістыкі, кітайскай філалогіі, найбуйнейшы цэнтр падрыхтоўкі замежных студэнтаў у галіне русістыкі.**

1400 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Беларуская філалогія», «Руская філалогія», «Славянская філалогія», «Класічная філалогія», «Рамана-германская філалогія», «Усходняя (кітайская) філалогія».

Філфак жыве пад дэвізам: «Роднае варта берагчы!» – і ахвотна дзеліцца ведамі з замежнымі навучэнцамі, па колькасці якіх займае вядучыя пазіцыі ў БДУ.

Хімічны факультэт

1931 г. **Хімічны факультэт – адзіная арганізацыя ў нашай краіне, дзе рыхтуюць хімікаў-універсалаў, здольных распрацоўваць і ўкараняць хімічныя тэхналогіі VI укладу, ствараць новыя матэрыялы і лекавыя рэчывы.**

765 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Фундаментальная хімія», «Хімія высокіх энергій», «Хімія лекавых злучэнняў», «Хімія (па напрамках)».

Факультэт з'яўляецца ядром хімічнага кластара БДУ, у які таксама ўваходзяць НДІ фізіка-хімічных праблем, тэхнапарк «Унітэхпрам» і прадпрыемства «Унікаштмет».

Эканамічны факультэт

1999 г. **Эканамічны факультэт – гэта ўнікальнае спалучэнне фундаментальных і прыкладных дысцыплін у галіне эканомікі і фінансаў.**

1800 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Эканамічная тэорыя», «Эканоміка», «Эканамічная інфарматыка», «Фінансы і крэдыт», «Эканамічная бяспека».

Студэнты неаднаразова перамагалі ў міжнародных турнірах, такіх як «Бітва банкаў СНД», чэмпіянат па карпаратыўных фінансах Growth Driver, міжнародны бізнес-хакатон Baltic Sea Digital Event, конкурс інавацыйных праектаў і стартапаў «Патэнцыял будучыні».

Юрыдычны факультэт

1925 г. **Вядучы навучальна-даследчы цэнтр па падрыхтоўцы прафесійных юрыстаў. Буйны міжнародны цэнтр прававых даследаванняў.**

2400 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Праваznаўства», «Эканамічнае права», «Паліталогія».

Цэнтр адукацыйных інавацый, лабараторыя крыміналістычнай тэхнікі і судовых экспертыз, а таксама «Юрыдычная клініка», дзе студэнты аказваюць бясплатную прававую дапамогу насельніцтву.

Інстытут тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ

2004 г. **Інстытут тэалогіі – першая багаслоўская ўстанова адукацыі ва Усходняй Еўропе, якая рыхтуе спецыялістаў у галіне тэалогіі, рэлігіязнаўства, філасофскай антрапалогіі. Інстытут з'яўляецца пляцоўкай для дыялогу па ўмацаванні міжрэлігійнага міру і згоды.**

124 студэнты. Спецыяльнасць: «Тэолаг-рэлігіязнаўца. Выкладчык грамадазнаўчых дысцыплін».

Адукацыйны працэс ажыццяўляецца па наступных напрамках: тэалагічная падрыхтоўка, рэлігіязнаўчая падрыхтоўка, гуманітарная падрыхтоўка, філалагічная падрыхтоўка, псіхолага-педагагічная падрыхтоўка.

Інстытут бізнесу БДУ

1996 г. **Інстытут бізнесу БДУ – лідар нацыянальнай сістэмы бізнес-адукацыі, забяспечвае падрыхтоўку прафесійных менеджараў, якія валодаюць сучаснымі тэхналогіямі бізнесу і кіравання, здольныя эфектыўна развівацца ва ўмовах лічбавай эканомікі.**

3500+ студэнтаў. Спецыяльнасці: «Бізнес-адміністраванне», «Лагістыка», «Маркетынг», «Кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі».

Інстытут бізнесу БДУ – гэта 50+ адукацыйных праграм, 25+ гадоў на рынку бізнес-адукацыі, 60+ замежных партнёраў, міжнародная акрэдытацыя якасці CEEMAN IQA.

Сумесны інстытут БДУ і Далянскага політэхнічнага ўніверсітэта (Кітай)

2019 г. **Адукацыйны працэс ажыццяўляецца на базе трох факультэтаў БДУ: фізічнага, механіка-матэматычнага і факультэта міжнародных адносін. Чытанне лекцый забяспечваюць выкладчыкі як БДУ, так і ДПУ.**

150 студэнтаў. Спецыяльнасці: «Фізіка (вытворчая дзейнасць)», «Механіка і матэматычнае мадэляванне», «Сусветная эканоміка».

Студэнты СІБД маюць магчымасць не толькі атрымаць актуальныя веды па сваёй спецыяльнасці, але і ўдасканальваць веды англійскай мовы (выкладанне шэрагу дысцыплін ажыццяўляецца на ёй), а таксама асвоіць базавы курс кітайскай мовы.

Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава БДУ

1992 г. **МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ – вядучы адукацыйны і навукова-метадычны цэнтр Беларусі па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы спецыялістаў экалагічнага профілю і спецыялістаў у сферы ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, базавая арганізацыя дзяржаўнага СНД па экалагічнай адукацыі.**

1863 студэнты. Спецыяльнасці: «Прыродаахоўная дзейнасць», «Энергаэфектыўныя тэхналогіі і энергетычны менеджмент», «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі», «Ядзерная і радыяцыйная бяспека», «Медыцынская фізіка», «Медыка-біялагічная справа», «Медыцынская экалогія».

Асноўнымі задачамі МДЭІ імя А. Д. Сахарава з'яўляюцца: забеспячэнне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі, экалагічны кантроль і маніторынг навакольнага асяроддзя; даследаванні ў галіне біяхіміі, генетыкі, імуналогіі, клініка-лабараторная дыягностыка.

Інстытут дадатковай адукацыі

2020 г. **У структуру ІДА ўваходзяць: факультэт даўніверсітэцкай адукацыі замежных грамадзян; навучальны цэнтр даўніверсітэцкай падрыхтоўкі; факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі.**

735 слухачоў. Падрыхтоўчыя аддзяленні для беларускіх грамадзян і для замежных грамадзян, а таксама падрыхтоўчыя курсы для абітурыентаў.

ІДА вырашае задачы па прафесійнай арыентацыі моладзі, падрыхтоўцы яе да паступлення ў ВНУ, адаптацыі замежных грамадзян да навучання ў Беларусі, а таксама перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі на базе вышэйшай адукацыі.

Ліцэй БДУ

1989 г. **Лідар сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі Рэспублікі Беларусь. Найлепшая ўстанова адукацыі Беларусі па выніках рэспубліканскіх і міжнародных прадметных алімпіяд.**

528 ліцэістаў. 11 профіляў навучання: філалагічны, гісторыка-грамадазнаўчы, гуманітарны, лінгвістычны, біялагічны, хімічны, матэматычны, эканамічны, фізічны і адзіныя ў краіне інфарматыка-матэматычны і інфарматыка-фізічны профілі.

У Ліцэі БДУ важнае месца займае падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання. Штогод нашы выпускнікі маюць самы высокі сярэдні бал па ЦТ сярод выпускнікоў устаноў сярэдняй адукацыі.

Юрыдычны каледж БДУ

2000 г. **Адзіная профільная і галоўная ўстанова адукацыі па падрыхтоўцы юрыстаў сярэдняга звяна ў Беларусі.**

430 навучэнцаў. Спецыяльнасць: «Праваznаўства».

Будучыня паспяховага юрыста пачынаецца ў Юрыдычным каледжы БДУ. Больш за 90 % выпускнікоў працягваюць навучанне ў беларускіх установах вышэйшай адукацыі.

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

Высокія тэхналогіі ў навуцы

БДУ займае адмысловае месца ў сістэме навуковых арганізацый Беларусі.

БДУ з'яўляецца галаўной арганізацыяй па 10 дзяржаўных праграмах навуковых даследаванняў, 2 дзяржаўных навукова-тэхнічных праграмах; удзельнічае ў выкананні заданняў 12 ДНПД, 7 ДНТП, 4 праграм Саюзнай дзяржавы, 4 Дзяржаўных праграм, 1 галіновай НТП, 2 інавацыйных праектаў. Аб'ём фінансавання навуковай сферы штогод складае больш чым 30 млн руб. БДУ мае статус акрэдытаванай навуковай арганізацыі. За апошнія тры гады экспарт навукаёмістай высокатэхналагічнай прадукцыі (прац, паслуг) склаў 8,1 млн долараў ЗША, падраздзяленнямі комплексу БДУ выпускалася больш за 100 найменняў навукаёмістай прадукцыі, у тым ліку для экспарту.

Падрыхтоўка навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі

Пры БДУ дзейнічаюць 22 доктарскія саветы па абароне дысертацый. За апошнія пяць гадоў БДУ двойчы абвяшчаўся Міністэрствам адукацыі Беларусі «найлепшай установай, якая ажыццяўляе падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі».

За апошнія пяць гадоў супрацоўнікамі і навучэнцамі комплексу БДУ абаронена 276 кандыдацкіх і 37 доктарскіх дысертацый, работнікам універсітэта прысвоена 38 навуковых званняў прафесара і 169 – дацэнта.

Публікацыйная дзейнасць

Штогод вынікі навуковай дзейнасці БДУ прадстаўляюцца больш чым у12 тыс. навуковых публікацый і выданняў, з іх: 1 тыс. манаграфій, падручнікаў, навучальных дапаможнікаў, зборнікаў навуковых прац; 5 тыс. навуковых артыкулаў, з якіх 800 артыкулаў індэксуюцца ў Scopus і Web of Science. Выдаецца 16 часопісаў і 2 зборнікі навуковых артыкулаў, якія ўваходзяць у лік навуковых выданняў ВАК Беларусі. Часопіс «Беларускі дзяржаўны універсітэт. Матэматыка. Інфарматыка» ўключаны ў базу даных Scopus.

Увогуле, публікацыі навукоўцаў БДУ ў Scopus складаюць больш за 30 % ад усіх артыкулаў з Беларусі.

Узнагароды навукоўцам

У 1993 г. у БДУ быў арганізаваны конкурс на суісканне прэмій імя У. І. Пічэты і А. Н. Сеўчанкі.

Прэмія імя У. І. Пічэты прысуджаецца ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук, прэмія імя А. Н. Сеўчанкі – у галіне прыродазнаўчых і тэхнічных навук навукоўцам, а таксама маладым навукоўцам у намінацыях «Навука» і «Адукацыя».

Інавацыі ў адукацыі

БДУ ажыццяўляе якасную рэалізацыю замовы на адукацыю з боку навучэнца і соцыуму з арыентацыяй на лічбавізацыю і міждысцыплінарнасць.

Сёння на 16 факультэтах і ў 4 адукацыйных інстытутах БДУ вядзецца падрыхтоўка студэнтаў на першай ступені атрымання адукацыі больш чым па 80 спецыяльнасцях, а на другой – больш чым па 45. Новыя спецыяльнасці арыентаваныя на міждысцыплінарнасць: эканамічная бяспека, рэгіёназнаўства, біяінфарматыка. Выкладанне 192 дысцыплін праводзіцца на англійскай мове.

На базе БДУ ажыццяўляецца эксперыментальная і інавацыйная дзейнасць. Рэалізаваны 4 адукацыйных праекты з Міністэрствам адукацыі Беларусі, узгоднены 2 эксперыментальныя праекты для рэалізацыі ў 2021/2022 гг.

Для падтрымкі таленавітай моладзі, павышэння цікавасці да навуковай дзейнасці, зацікаўленасці ў асваенні інавацыйных тэхналогій рэалізуюцца наступныя ***стыпендыяльныя праграмы:***

1) Стыпендыя Wargaming. Уладальнікамі гранта сталі 96 студэнтаў.

2) Стыпендыя канцэрна BASF. Атрымалі каля 20 студэнтаў.

3) Стыпендыя кампаніі Huawei (рэалізуецца з 2020/2021 навуч. года). Яе атрымалі 2 студэнты, 4 магістранты і 2 аспіранты.

Створаны 2 лабараторыі сумесна з вядучымі сусветнымі кампаніямі: на кафедры энергафізікі створана сумесная з ТАА «Ізавак» СНДЛ «Танкаплёначныя тэхналогіі», а таксама інавацыйная лабараторыя SAP Next-Gen Lab на ФПМІ.

Лічбавізацыя адукацыйнага працэсу

У БДУ паспяхова функцыянуе Адукацыйны партал – сістэма кіравання навучаннем, створаная на базе LMS Moodle.

Карыстальнікамі Адукацыйнага партала БДУ з'яўляюцца больш за 25 000 работнікаў і студэнтаў.

Электронным адукацыйным кантэнтам забяспечаны больш за 7 800 навучальных дысцыплін універсітэта, што ў сярэднім па факультэтах складае 88 %.

Крэатыўнасць у адукацыі

У БДУ створана сітэма, арыентаваная на творчую самарэалізацыю студэнтаў. Яна ўключае павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў у межах інавацыйнай праграмы «Методыка навучання праз адкрыццё: як навучаць усіх па рознаму, але адналькава» (аўтар праграмы – рэктар А. Д. Кароль), падрыхтоўку аўтарскіх метадычных распрацовак, а таксама ўкараненне эўрыстычных, даследчых навучальных матэрыялаў.

Індывідуалізацыя навучання

Асаблівасцю выкарыстання дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій у БДУ з'яўляецца тое, што працэс будуецца на прынцыпах інтэрнэт-адукацыі крэатыўнага тыпу. Індывідуалізацыя адукацыі, развіццё універсальных навучальных дзейнасцяў і інфармацыйна-камунікатыўных кампетэнтнасцяў навучэнцаў паспяхова вырашаецца з дапамогай арганізацыі эўрыстычнага, дыялогавага навучання.

У БДУ з 2019 г. укаранёны эксперымент па магчымасці для студэнтаў асвойваць змест навучальных дысцыплін, якія не ўваходзяць у навучальныя планы абраных імі спецыяльнасцяў. Дадатковыя навучальныя дысцыпліны вывучаюцца на платнай аснове, уносяцца ў дадатак да дыплома.

Для аказання навучэнцам усебаковай дапамогі ў праектаванні індывідуальнай адукацыйнай траекторыі ў БДУ ўкараняецца *інстытут цьютарства*. У лютым 2021 г. прайшло навучанне групы педагогаў-цьютараў па праграме дадатковай адукацыі дарослых. Гэта першы досвед падрыхтоўкі такіх спецыялістаў не толькі ва ўніверсітэце, але і ў краіне.

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

БДУ ўваходзіць у 1 % найлепшых універсітэтаў свету!

БДУ знаходзіцца ў дзясятцы найлепшых універсітэтаў СНД, канкуруе з вядучымі ўніверсітэтамі суседніх краін.

Увогуле, БДУ ранжыраваны ў 10 глабальных, 7 прадметных і 1 рэгіянальным рэйтынгу, дзе з'яўляецца найлепшым універсітэтам Беларусі. З 2011 г. БДУ ўключаны ў прэстыжны брытанскі рэйтынг QS World University Rankings. У 2021 г. наш універсітэт здолеў падняцца да 295 пазіцыі і апярэдзіў усе польскія ўніверсітэты, а таксама ВНУ Літвы і Украіны.

Пазіцыі ў рэйтынгу іграюць вызначальную ролю пры выбары ВНУ замежнымі грамадзянамі, а таксама спрашчаюць працэдуру прызнання дыпломаў за мяжой.

З 2015 г. БДУ ўключаны ў THE World University Rankings, з 2017 г. у Best Global Universities Rankings кампаніі U.S. News & World Report (найлепшая пазіцыя – 346).

З 2017 г. БДУ таксама стабільна ўваходзіць у топ найлепшых універсітэтаў Шанхайскага прадметнага рэйтынгу па фізіцы (ARWU). З 2020 г. ён значна палепшыў пазіцыі да ўзроўню 201-300.

Міжнародная дзейнасць

У БДУ навучаецца звыш 4000 замежных грамадзян, што складае амаль 20 % ад усіх навучэнцаў дзённай формы. Больш за ўсё грамадзян з Кітая і краін СНД.

БДУ бярэ ўдзел у дзейнасці шэрагу міжнародных асацыяцый і сетак, а таксама ў двухбаковых міжуніверсітэцкіх праграмах акадэмічнага абмену з дзясяткамі краін Азіі і Еўропы. Штогод сотні студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта праходзяць навучанне і стажыроўкі за мяжой.

Паміж БДУ і замежнымі адукацыйнымі і навуковымі ўстановамі, міжнароднымі кампаніямі і арганізацыямі падпісана больш за 550 дакументаў аб супрацоўніцтве. Геаграфія прамога міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва ахоплівае 59 краін. Найбольшая колькасць дамоў падпісана з установамі Расіі, Кітая, Польшчы, Украіны, Германіі. Штогод БДУ прымае дзясяткі міжнародных дэлегацый.

Сумесныя адукацыйныя праграмы

У БДУ рэалізуюцца дзясяткі сумесных адукацыйных праграм I і II ступеняў вышэйшай адукацыі і аспірантуры з замежнымі ўніверсітэтамі з Кітая, Германіі, Расіі, Узбекістана, Таджыкістана. Функцыянуюць сумесныя інстытуты БДУ з Далянскім політэхнічным універсітэтам (Кітай), Таджыкскім нацыянальным універсітэтам (Таджыкістан). БДУ ўваходзіць у Сеткавы ўніверсітэт СНД, дзе студэнты могуць навучацца 1–2 семестры ў самых вядомых універсітэтах Масквы, такіх як РУДН, МДІМА і інш.

Варта адзначыць сумесную магістратуру БДУ і МДУ імя М. В. Ламаносава па профілі «Гісторыя беларускай дыяспары»; англамоўную магістарскую праграму па профілі «Кіраванне ў рэальным сектары эканомікі» ў супрацоўніцтве з Універсітэтам прыкладных навук г. Мітвайда (Германія). У Кітаі і Турцыі працуюць 5 інфармацыйных цэнтраў БДУ.

Навуковыя дасягненні БДУ

Распрацоўкі БДУ шырока выкарыстоўваюцца ў самых розных сферах дзейнасці – ад касмічных тэхналогій да сельскай гаспадаркі.

За апошнія пяць гадоў навукова-тэхнічная прадукцыя БДУ экспанавалася на 129 выставах, у тым ліку на 75 міжнародных. На выставе-кангрэсе «Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі» (HI-TECH) у Санкт-Пецярбургу з 2005 г. распрацоўкі БДУ атрымалі 5 спецыяльных прызоў, 81 залаты і 90 сярэбраных медалёў, 39 дыпломаў.

Больш за 300 сеансаў па лячэнні анкалагічных захворванняў унутраных органаў праведзена на камп'ютарызаванай гіпертэрмічнай устаноўцы «Пціч-М».

207 спірометраў «МАС-1», прызначаных для ацэнкі стану дыхальнай сістэмы чалавека, было пастаўлена ў Інданезію.

Сельская гаспадарка, прамысловасць

Да 40 % дадатку ўраджаю агароднінных культур забяспечвае выкарыстанне распрацаваных на аснове бактэрый прэпаратаў, прызначаных для абароны і рэгуляцыі росту раслін. Попыт на прэпараты «Аўрын», «Бактаген», «Немацыд КС», «Стымул», «Максімун» перавышае выпуск.

Унікальныя ветэрынарныя біяпрэпараты, якія выпускаюцца прадпрыемствам-рэзідэнтам тэхнапарка БДУ, пастаўляюцца ў краіны ЕАЭС. Усе яны адносяцца да VI тэхналагічнага ўкладу.

Штогод у БДУ вырабляецца ад 15 да 20 тысяч ферамонных прэпаратаў для барацьбы са шкоднікамі лясоў.

Больш чым 20 тон харчовых дадаткаў, якія ўзбагачаюць вітамінамі і іншымі карысным інгрэдыентамі хлебабулачныя і мясныя вырабы, адгружаецца на заводы нашай краіны.

Хімія

За апошняе дзесяцігоддзе больш за 20 тэхналогій атрымання гальванічных і хімічна асаджальных з раствораў пакрыццяў распрацаваны НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ і асвоены на прадпрыемствах Беларусі і за мяжой. Ультрачорныя плёнкі, прызначаныя для зніжэння інтэнсіўнасці рассеянага святла ў спектральных вымяральных прыборах (тэлескопах, далямерах, прыборах начнога бачання, монахраматарах і г. д.), пераўзыходзяць сусветныя аналагі па шэрагу тэхнічных параметраў.

Сфера прымянення тэрмаўстойлівых матэрыялаў на аснове фасфатных злучэнняў з рабочымі тэмпературамі да 1700 °С ахоплівае не толькі будаўніцтва, але і такія галіны, як ядзерная энергетыка і стварэнне ракетна-касмічнай і авіяцыйнай тэхнікі.

Прыборы і абсталяванне

Выраблена больш за 160 навукаёмкіх комплексаў тэхналагічнага абсталявання для вытворчасці тавараў з эластычных, інтэгральных і цвёрдых пенаполіўрэтанаў, якія адпавядаюць найлепшым сусветным аналагам.

У Анголе, Балгарыі, Казахстане, М'янме, Перу, Туркменістане, Угандзе выкарыстоўваюцца на паветраных суднах аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі палётнай інфармацыі «Дзвіна-М».

На РУП ПА «Беларуськалій» укаранёная сучасная карпаратыўная аўтаматызаваная сістэма праектавання і геолага-маркшэйдарскага суправаджэння горных прац.

Космас

БДУ звыш дваццаці гадоў плённа супрацоўнічае з ракетна-касмічнай карпарацыяй «Энергія» (Расія). Пяць распрацаваных НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі праграмна-апаратных комплексаў выкарыстоўваюцца на Міжнародай касмічнай станцыі (МКС).

Створана лінейка крыніц сілкавання і генератараў моцнатоававых імпульсаў магутнасцю 1–10 кВт. Каля 300 крыніц сілкавання былі пастаўлены па кантрактах для прадпрыемстваў Расійскай Федэрацыі.

Медыцына

Паспяхова праведзены больш за 3 000 аперацый з выкарыстаннем распрацаванага ў БДУ супрацьпухлінnага лекавага прэпарата «Цысплацел». Распрацаваны новыя віды эфектыўных супрацьпухлінных сродкаў – прэпараты «Тэмадэкс» і «Праспідэлонг».

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

Значныя даты ў 100 гадовай гісторыі БДУ

Захоўвайце сувязь з Універсітэтам
і вашымі настаўнікамі,
абаронце наш храм навукі
сваёй вялікай любоўю ад усяго вашага маладога сэрца.

З выступлення першага рэктара
У. І. Пічэты перад першымі выпускнікамі БДУ. 20 лютага 1925 г.

25 лютага 1919 г. – ЦВК БССР прыняў дэкрэт пра адкрыццё Беларускага ўніверсітэта – першай вышэйшай навучальнай установы Савецкай Беларусі.

9 ліпеня 1921 г. – рэктарам БДУ стаў У. І. Пічэта.

11 ліпеня 1921 г. – у гарадскім тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае адкрыццю БДУ.

30 кастрычніка 1921 г. – адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны пачатку заняткаў на медыцынскім факультэце і факультэце грамадскіх навук БДУ.

20 сакавіка 1922 г. – выйшаў першы нумар «Прац БДУ» тыражом у 1 тыс. асобнікаў.

Восень 1922 г. – створаны педагагічны факультэт.

29 чэрвеня 1923 г. – на рабфаку адбыўся першы выпуск (41 спецыяліст).

20 лютага 1925 г. – першы выпуск ФГН даў народнай гаспадарцы краіны 60 эканамістаў і юрыстаў.

6 жніўня 1927 г. – у БДУ адкрыта аспірантура.

3 верасня 1930 г. – адкрыты дзверы першых карпусоў універсітэцкага гарадка.


Новы корпус БДУ і пасляваенныя руіны

Верасень 1961 г. – створаны факультэт даўніверсітэцкай адукацыі.

Сакавік 1964 г. – на гістарычным факультэце адкрыты нумізматычны кабінет, адзіны ў ВНУ краіны.

16 лютага 1966 г. – БДУ імя У. І. Леніна прыняты ў члены Міжнароднай асацыяцыі ўніверсітэтаў.

7 студзеня 1967 г. – Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за заслугі ў развіцці навукі і падрыхтоўкі спецыялістаў БДУ ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

16 снежня 1968 г. – рашэннем ЦК КПБ, Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрафа за поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў БДУ ўзнагароджаны Памятным Сцягам.

У 1970 г. на базе трох кафедраў матэматычнага факультэта быў створаны факультэт прыкладной матэматыкі, дзякуючы прафесару Я. А. Іванову, які арганізоўваў і доўгія гады ўзначальваў ФПМ.

З чэрвеня 1980 года. Візіт Першага сакратара ЦК КПБ Пятра Машэрава ў БДУ

12 сакавіка 1981 г. – адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны ўручэнню БДУ імя У. І. Леніна пераходнага Чырвонага сцяга.

22 чэрвеня 1982 г. – за ўдзел у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў шматтыражная газета «Беларускі ўніверсітэт» узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

1 верасня 1984 г. – упершыню быў урачыста адзначаны Дзень ведаў.

21 мая 1986 г. – быў створаны НДІ ядзерных праблем БДУ.

12 лістапада 1987 г. – было апублікавана пасланне пра студэнцкае самакіраванне.

22 снежня 1988 г. – пачаў дзейнічаць навуковы цэнтр аэракасмічнай дыягностыкі прыродных рэсурсаў Зямлі.

18 ліпеня 1989 г. – выйшла пастанова «Пра арганізацыю пры БДУ імя Леніна Мінскай сярэдняй спецыялізаванай школы» (Ліцэй БДУ).

29 лістапада 2002 г. – на фасадзе галоўнага корпуса ўніверсітэта ўсталяваны герб БДУ.

11 чэрвеня 2003 г. – на базе ваеннай кафедры БДУ быў створаны ваенны факультэт.

12 мая 2006 г. – прайшоў першы форум студэнцкіх хароў «Папараць-кветка – 2006».

15 верасня 2006 г. – адбылося ўрачыстае адкрыццё навучальна-спартыўнага комплексу «Універсітэцкі».

16 верасня 2008 г. – адкрыццё мультымедыйнай бібліятэкі.

27 сакавіка 2009 г. – нагрудныя знакі «Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты БДУ» і «Лаўрэат прэміі імя А. Н. Сеўчанкі БДУ» зацверджаны Геральдычным саветам пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

7 верасня 2009 г. – створаны савет маладых навукоўцаў.

16 ліпеня 2010 г. – адкрыўся беларуска-кітайскі інавацыйны цэнтр на базе БДУ.

1921–1931 | 1931–1941 | 1941–1951 | 1951–1961 | 1961–1971 | 1971–1981 | 1981–1991 | 1991–2001 | 2001–2011 | 2011–2021

1930 г. – на базе медфака БДУ быў створаны медыцынскі інстытут.

7 ліпеня 1931 г. – прынята пастанова СНК БССР «Пра рэарганізацыю БДУ». Факультэт права і савецкага будаўніцтва вылучаны ў самастойны Інстытут савецкага будаўніцтва і права; факультэт народнай гаспадаркі рэарганізаваны ў Інстытут народнай гаспадаркі; на базе хіміка-тэхналагічнага факультэта створаны інстытут; сацыяльна-гістарычнае і літаратурна-лінгвістычнае аддзяленні педфака ўтварылі Вышэйшы педагагічны інстытут.

Верасень 1931 г. – хімічнае аддзяленне педагагічнага факультэта ператворанаў хімічны факультэт. Дэкан – М. А. Прыляжаеў.

8–9 студзеня 1934 г. – Першая Усебеларуская фізіка-матэматычная канферэнцыя была арганізавана БДУ і БелАН.

1 верасня 1934 г. – адкрыты гістарычны факультэт. Пачата выданне «Навуковых запісак» (гістарычная серыя).

10 лютага 1940 г. – у БДУ адкрыты гісторыка-археалагічны музей.

1930-я гады. Галоўны корпус БДУ. Студэнты ўніверсітэта на фізкультурных занятках

22 чэрвеня 1941 г. – студэнты і выкладчыкі збіраліся на ўрачыстае адкрыццё Камсамольскага возера. Але замест святкавання ўвесь горад слухаў экстранную аб'яву пра пачатак Вялікай Айчыннай вайны: «Увага! Увага! ...нахабны разбойніцкі напад Гітлера... наша справа правая, перамога будзе за намі!»

У ліпені 1941 г. у горадзе сталі ствараць першыя падпольныя групы, сярод якіх былі студэнты і выкладчыкі БДУ. Склалася камсамольска-моладзевая група Я. Ярмалінскага з цэнтрам на плодаагародніннай базе № 1 (вул. К. Лібкнехта, 43), і другая група – вакол студэнта хімічнага факультэта БДУ Г. Г. Фалевіча, з цэнтрам у аптэцы № 1 (вул. Савецкая).

15 мая 1943 г. – Саўнаркам СССР прыняў пастанову «Пра аднаўленне працы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта» на станцыі Сходня пад Масквой.

11 кастрычніка 1943 г. – на станцыі Сходня Кастрычніцкай чыгункі аднавіў працу Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

1 жніўня 1944 г. была прынята пастанова «Пра рээвакуацыю БДУ з Маскоўскай вобласці ў г. Мінск». Першая група студэнтаў БДУ ў складзе 26 чалавек на чале з І. П. Мележам вярнулася са станцыі Сходня ў г. Мінск 11 жніўня.

26 чэрвеня 1945 г. – выкладчыкі БДУ (прафесар У. М. Перцаў і дацэнт Ф. П. Шмыгаў) у складзе дэлегацыі ад БССР на канферэнцыі ў Сан-Францыска пакінулі свой подпіс пад Статутам ААН.

Снежань 1945 г. – створаны аркестр народных інструментаў, універсітэцкі хор.

У 1947 г. на гістарычным факультэце было адкрыта аддзяленне філасофіі, факультэт журналістыкі пераўтораны ў аддзяленне філалагічнага факультэта.

Красавік 1951 г. – у эксплуатацыю ўведзены інтэрнат № 1, знакамітая ўніверсітэцкая «капейка».

У 1952 г. быў арганізаваны пастаянна дзейны орган – рэктарат, у які ўваходзілі рэктар, прарэктары, дэканы, прадстаўнікі партарганізацый і прафкама.

31 жніўня 1954 г. – пачалося засяленне інтэрната Ына 400 месцаў па вул. Бабруйскай.

1954 г. – на базе геаграфічнага факультэта створана Геаграфічнае таварыства БССР, пасля – Геаграфічнае таварыства Беларусі (В. А. Дзяменцьеў, Л. М. Вазнячук, В. П. Якушка, Г. І. Марцінкевіч).

27 жніўня 1955 г. – на вучобу ў БДУ прыехалі студэнты з Польскай Народнай Рэспублікі.

У 1956 г. А. Н. Сеўчанка ўдзельнічаў у стварэнні ў г. Нью-Ёрк Міжнароднага агенцтва па выкарыстанні атамнай энергіі ў мірных мэтах.

У 1957 г. пры кафедры глебазнаўства быў арганізаваны глебавы атрад для правядзення суцэльнага картавання зямляў калгасаў і саўгасаў рэспублікі.

2 ліпеня 1958 г. – адбылася ўрачыстая закладка падмурка галоўнага корпуса БДУ па праекце архітэктараў М. Бакланава і А. Духана.


1954 год. Студэнты ў лабараторыі БДУ

1 сакавіка 1971 г. – створаны НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ.

1 верасня 1973 г. – пачаў дзейнічаць Інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў.

23 студзеня 1974 г. – адбылася сустрэча студэнтаў з лётчыкам-касманаўтам СССР П. І. Клімуком.

У 1975 г. матэматычны факультэт у сувязі з увядзеннем аддзялення механікі быў пераназваны ў механіка-матэматычны.

1976 г. – на базе радыёфізічнага аддзялення фізічнага факультэта быў створаны факультэт радыёфізікі і электронікі.

7 чэрвеня 1976 г. – адкрыты факультэт радыёфізікі і электронікі БДУ.

1977 г. – Міжнародная асацыяцыя тэарэтычнай і прыкладной лімналогіі ўзнагародзіла Г. Г. Вінберга залатым медалём Цінемана-Наўмана.

15 сакавіка 1977 г. – універсітэту ўручаны пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС.

30 жніўня 1977 г. – прынята Пастанова камітэта камсамола БДУ «Пра ўдзел студэнтаў універсітэта ва ўборцы ўраджаю 1977 г.». Зацверджана палажэнне пра студэнцкі сельскагаспадарчы атрад (ССГА).

22 лістапада 1977 г. – адкрыты НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ.

Снежань 1977 г. – адкрыты музей гісторыі БДУ.

30 студзеня 1978 г. – за заслугі ў аказанні дапамогі ўраду Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам у падрыхтоўцы навуковых і тэхнічных кадраў БДУ імя У. І. Леніна ўзнагароджаны ордэнам Дружбы.

Лістапад 1980 г. – створаны заслужаны аматарскі фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш».

Люты 1993 г. – уведзены ў дзеянне новы «Статут Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».

10 красавіка 1993 г. – на геаграфічным факультэце прайшла першая ў Беларусі выстава «Каменная казка».

Кастрычнік 1993 г. – ва ўніверсітэце заснаваны дзве новыя прэміі: імя У. І. Пічэты і імя А. Н. Сеўчанкі.

Верасень 1994 г. – на базе кафедры міжнароднага права створана кафедра ЮНЕСКА па правах чалавека і дэмакратыі.

1 кастрычніка 1995 г. – быў створаны факультэт міжнародных адносін БДУ.

8 красавіка 1997 г. – арганізаваўся Студэнцкі саюз БДУ. Рэктарат і студэнцкі саюз МДУ павіншавалі студэнтаў БДУ са стварэннем моладзевай арганізацыі.

10 снежня 1998 г. – у дворыку ўніверсітэта ўсталяваны помнік Францыску Скарыну.

1 сакавіка 1999 г. – створаны эканамічны факультэт і факультэт філасофіі і сацыяльных навук.

30 верасня 1999 г. – было створана навучальна-навукова-вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Унітэхпрам БДУ».

1999 год. Парад факультэтаў на Дні ведаў

3 лютага 2012 г. – паводле Сусветнага рэйтынгу ўніверсітэтаў Webometrics, БДУ заняў 843 радок.

1 жніўня 2012 г. – быў створаны беларуска-в'етнамскі інавацыйна-адукацыйны цэнтр.

Верасень 2012 г. – студэнт юрыдычнага факультэта І. Бокі на летніх Паралімпійскіх гульнях у Лондане выйграў шэсць медалёў: пяць залатых і адзін сярэбраны.

3 красавіка 2013 г. – уручэнне прэстыжнай міжнароднай прэміі Scopus Award Belarus.

5 чэрвеня 2013 г. – у БДУ ўпершыню прайшоў сеанс радыёсувязі з Міжнароднай касмічнай станцыяй.

27 студзеня 2016 г. – электронная бібліятэка БДУ ўвайшла ў сотню найлепшых універсітэцкіх бібліятэк свету.

30 кастрычніка 2018 г. – спадарожнік BSUSat-1 Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта паспяхова выведзены на арбіту вышынёй больш за 500 кіламетраў над паверхняй Зямлі.

15 красавіка 2019 г. – на базе БДУ быў адкрыты сумесны беларуска-кітайскі інстытут з Далянскім політэхнічным універсітэтам.

30 кастрычніка 2021 г. – святкуецца 100-годдзе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

2019 год. Студэнты БДУ перад корпусам ФМА

Да свайго 100-годдзя БДУ рыхтаваўся маштабна. Сотня мерапрыемстваў, акцыі, падзеі міжнароднага маштабу. Старт святкаванню юбілею быў дадзены 30 кастрычніка мінулага года, калі міністр адукацыі Беларусі Ігар Карпенка, рэктар БДУ Андрэй Кароль, загадчык кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта Алег Яноўскі і чацвёртакурсніца ФМА Ульяна Бычкова націснулі сімвалічную кнопку зваротнага адліку да 100-годдзя ўніверсітэта. Узгадаем найбольш цікавыя мерапрыемствы.

За год – 100 падзей

Рэканструкцыя ўніверсітэцкага музея землязнаўства стала адным з першых мерапрыемстваў па мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы да 100-годдзя БДУ. Размешчаны ён на першым паверсе факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі і мае плошчу 212 м². У аснову канцэпцыі сучаснага музея пакладзена ідэя стварэння адукацыйна-асветніцкай базы ў галіне геалогіі. Таму ў структуру ўключаны дэманстрацыйная і навучальна-метадычная залы. У першай прадстаўлены калекцыі мінералаў і горных парод, самацветаў, аметыстаў, палеанталагічны аддзел, экспанаты мамантавай фаўны. Экспанаты ў другой зале размешчаны ў адпаведнасці з навучальнымі дысцыплінамі факультэта – «Мінералогія», «Петраграфія», «Палеанталогія» і «Палеагеаграфія».

Дакументальны фільм пра першага рэктара «Пячэта. Жыццё і лёс». У ім распавядаецца пра жыццёвы шлях навукоўца, акадэміка акадэмій навук БССР і СССР Уладзіміра Іванавіча Пячэты. Гледачы знаёмяцца з цікавымі фактамі з дзяцінства, малалецтва і перыяду рэктарства, а таксама з біяграфіяй бацькоў Пячэты.

Музей гісторыі студэнцкіх інтэрнатаў адкрыўся на чацвёртым паверсе інтэрната № 11. Паказана гістарычная рэтраспектыва самых значных падзей студэнцкага жыцця, пачынаючы з 1926 г. У музеі знаходзіцца больш за 300 экспанатаў. Сярод іх фотаматэрыялы, кнігі, макеты будынкаў, прадметы побыту, а таксама ўзнагароды студэнтаў і супрацоўнікаў гаратка. У музеі захоўваюцца таксама архіўныя дакументы. Адзін з іх – «Правілы пражывання студэнтаў у інтэрнаце» 1926 года.

Паказ уласнага брэндбука БДУ прайшоў 18 сакавіка. Ён уключае элементы фірмовага стылю ўніверсітэта: юбілейны лагатып на рускай, беларускай і англійскай мовах, палітру фірмовых колераў, шрыфтоў і арнаменту «васьміног». Падчас мерапрыемства гасцям прадставілі варыянты выкарыстання карпаратыўнай сімволікі на заплечніках, сумках, ататніках, тэрмакубках, ручках і інш. Студэнты ў якасці мадэляў прадэманстравалі мужчынскія і жаночыя майкі, байкі, джэмперы, кепкі.

Алею «100 дрэў БДУ» высадзілі ў парку «Сямейнае дрэва», размешчанага на скрыжаванні вуліц Прытыцкага і Нёманскай. Прадстаўнікі ўніверсітэта часта ўдзельнічаюць у акцыях па азеляненні горада і паляпшэнні яго экалогіі. 30 сакавіка студэнты і супрацоўнікі сумесна з грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Беларусі» ўсталявалі 100 шпакоўняў па Мінску, у межах рэспубліканскага суботніка на тэрыторыі Студэнцкай вёскі высадзілі 100 кустоў ядлоўцу і туй.

Акцыя «Паэтычнае стагоддзе» стартавала ўжо з 1 красавіка, накіраваная на стварэнне паэтычнага летапісу альма-матар. Павішаваць універсітэт напярэдадні векавога юбілею прапанавалася ў фармаце паэтычных відэапаштовак. Гэта аўтарскія творы, прысвечаныя БДУ, студэнцтву, выкладчыкам, а таксама ўжо напісаныя і адрасаваныя ВНУ вершы.

Фэст актыўнага ладу жыцця BSU Fest – 2021 прайшоў 15 мая. У гэты дзень разгарнулася праца каля 20 тэматычных пляцовак. Былі арганізаваны мастацкія выставы, фотазоны, б'юці-зоны з майстар-класамі па макіяжы. Акрамя таго, у праграме былі інтэлектуальныя конкурсы, квесты, выстава навукова-тэхнічных дасягненняў БДУ, прававзненне эксперыментаў у галіне фізікі, хіміі, біялогіі і іншых навук. Аматары фільмаў наведалі імправізаваную кіназалу на адкрытым паветры.

Сімвалічная выкладка сцяны адбылася 22 красавіка ў Галоўным корпусе БДУ, дзе вядуцца будаўнічыя працы па рэканструкцыі. У мерапрыемстве прынялі ўдзел кіраўніцтва, выкладчыкі і студэнты фізічнага факультэта. Студэнты самі пажадалі зрабіць асабісты ўнёсак у рэканструкцыю роднага факультэта і пакінуць для гісторыі БДУ памяць пра сучасную моладзь.

Адкрыты фэст скандынаўскай хады ўпершыню прайшоў 30 красавіка і сабраў больш за 200 чалавек. Яны спаборнічалі ў асабістым і камандным заліках на дыстанцыях 2,5 і 5 км. Фэст быў прымеркаваны да акцыі «Я кроч», у рамках якой студэнты, супрацоўнікі і выкладчыкі павінны былі пераадолець 100 тысяч кіламетраў.

Праект «100 гадоў – 100 фота» рэалізавала Фундаментальная бібліятэка БДУ, якая таксама святкавала сёлета свой векавы юбілей. У канцэпцыю пакладзена ідэя паказаць праз гістарычную анлайн-фотагалерэю станаўленне і сучаснасць першай універсітэцкай бібліятэкі Беларусі. Фотагалерэя падзелена на перыяды: 1921–1960, 1961–1990, 1991–2021, якія адлюстроўваюць асноўныя вехі развіцця бібліятэкі.

Да юбілею ФБ была прымеркавана XXI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Менеджмент міжуніверсітэцкіх бібліятэк». Яе ўдзельнікамі сталі 250 кіраўнікоў і спецыялістаў бібліятэк, устаноў вышэйшай адукацыі і навукі, інфармацыйных цэнтраў, выдавецтваў з васьмі краін.

Вечар духоўнай музыкі прайшоў сёлета ў адмысловым фармаце. 21 мая ўдзельнікі імпрэзы ў галоўным універсітэцкім кампусе выканалі духоўныя спевы. Галоўнай падзеяй стала сумесная малітва прадстаўнікоў праваслаўнага і каталіцкага духавенства, студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, а таксама артыстаў форуму студэнцкіх хароў «Папараць-кветка». Сімвалічным завяршэннем малітвы стаў падарунак БДУ да яго 100-годдзя юбілейнай граматы ад Уладыкі Веніяміна. Таксама ён прэзентаваў універсітэту абраз прападобнай Ефрасінні Полацкай.

У рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ выходзілі тэматычныя рубрыкі. У газеце «СБ. Беларусь сёння» адкрыты рубрыкі «100 гадоў БДУ. Успамінаем – ганарымся» і «100 гадоў БДУ. Гісторыя ў асобах». У іх матэрыялы пра першыя дні і сучаснае жыццё ўніверсітэта і нарысы пра вядомых навукоўцаў і таленавітых педагогаў. А ў газеце «Звязда» выходзіць рубрыка «Невядомы БДУ» – пра малавядомыя факты, звязаныя з універсітэтам, яго супрацоўнікамі і студэнтамі.

У рэгіянальных СМІ Беларусі на працягу года выходзіла рубрыка «БДУ ва ўсіх кутках Беларусі». У ёй інтэрв'ю з прадстаўнікамі рэктарата, дэканамі, выбітнымі навукоўцамі і даследчыкамі.

Аблічбаваны ўвесь архіў газеты «Універсітэт». Першы нумар выдання БДУ выйшаў у 1929 г.

Доўгі час нумары даваеннага перыяду захоўваліся ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы (Санкт-Пецярбург) і былі недаступныя для грамадскасці. Некаторыя асобнікі за 1950–1960-я гады знаходзіліся ў Нацыянальнай кніжнай палаце Беларусі. Зараз усе ахвотнікі могуць пазнаёміцца з поўнай калекцыяй і рарытэтнымі публікацыямі.

Студэнцкі турыстычны злёт «100-гадовая гісторыя поспеху» прайшоў 28–30 мая на базе аздараўленчага комплексу «Высокі бераг». Яго ўдзельнікамі сталі звыш 250 студэнтаў з усіх факультэтаў БДУ. Праграма мерапрыемства ўключыла змаганні па спартыўным і начным арыентаванні, валейболе, лазертагу, тэхніцы пешаходнага і воднага турызму.

Урачыстае мерапрыемства з удзелам Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЕСКА адбылося з нагоды юбілею ўніверсітэта. На ім святкаванне 100-годдзя БДУ ўключылі ў спіс памятных дат ЮНЕСКА, што надало гэтай падзеі міжнародны статус. Адпаведнае рашэнне было прынята на 40-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА. Усяго ў каляндар мерапрыемстваў на 2020–2021 гады ўвайшло 59 найбольш важных падзей з усяго свету. Пры падтрымцы ЮНЕСКА з усіх устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі толькі даты БДУ ў розны час былі ўключаны ў спіс.

Таварыскі матч па футболе прайшоў 23 чэрвеня ў СК «Універсітэцкі» дзеля дэманстрацыі ўнёску беларускай ВНУ ў спартыўныя дасягненні краіны.

Сустрэліся каманды «Энергетык-БДУ», зборная студэнтаў, выкладчыкаў і Рэспубліканскага цэнтра алімпійскага рэзерву па футболе.

15 імянных аўдыторый адкрылі сёлета ў гонар выбітных работнікаў БДУ. На працягу юбілейнага года з'яўляліся кабінеты імя дактароў навук, прафесараў, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё ўніверсітэта: Івана Прусава і Анатоля Кілбаса на механіка-матэматычным факультэце, Юрыя Багданава, Яўгена Іванова, Рафаіла Габасава і Генадзя Мядзведзева на ФПМІ, Міхаіла Чэркаса на ФСК. На філалагічным, гістарычным факультэтах і факультэце міжнародных адносін таксама ўшанаваны імёны вядомых дзеячаў.

Пасланне для будучых студэнтаў заклалі ў капсулу часу выпускніці 2021 г. на ўрачыстай цырымоніі 24 чэрвеня. Захоўвацца капсула будзе ва ўніверсітэце 100 гадоў для выпускніцы 2121 г.

У пасланні высока ацэнена магчымасць цяперашняга пакалення вучыцца ў адной з найбольш аўтарытэтных ВНУ, якая ўваходзіць у 1 % найлепшых універсітэтаў свету. Таксама выказана падзяка выкладчыкам, навукоўцам і супрацоўнікам ны вайны распачалі навучальны працэс. МДУ імя М. В. Ламаносава перадаў вялікую колькасць навучальнага і навуковага абсталявання, падручнікаў і наглядных дапаможнікаў, 18 тысяч тамоў навуковай літаратуры. Заняткі праводзілі 90 выкладчыкаў на шасці факультэтах БДУ для 300 студэнтаў. Студэнты і супрацоўнікі беларускай ВНУ ўсклалі кветкі ля гістарычнага месца ў знак падзякі выкладчыкам і іх вучням за захаванне ўзнагародзяць выпускніцу і партнёраў за ўмацаванне традыцый і аўтарытэту БДУ.

Нагрудны знак выкананы ў выглядзе круглага медальёна дыяметрам 3,5 см. На асабовым баку намаляваны галінка папараці, абрэвіятура БДУ і сімвалічная лічба 100. Унізе размешчаны год заснавання ўніверсітэта – 1921. На адваротным баку адлюстраваны рэльефны элемент БДУ, пераемны ад беларускага арнаменту «васьміног». Гэты ж малюнак скарыстаны для акантоўкі медаля з абодвух бакоў. Выраблены нагрудны знак з металу серабрыстага колеру з залатымі элементамі. Калодка абгарнутая стужкай цёмна-сіняга колеру.

Шакалад «Любімая Алёнка» з лагатыпам 100-годдзя БДУ паступіў у продаж. Лагатып месціцца на стограмовай плітцы класічнага малочнага шакаладу. Побач з сімвалічнай лічбай «100» у залатым колеры і назвай «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт» намаляваны знак-эмблема ВНУ – галінка папараці, якая сімвалізуе мудрасць і асвету.

У рамках праекта «Памяць і слава» вялася праца па пошуку і добраўпарадкаванні пахаванняў выкладчыкаў і навукоўцаў БДУ. Валанцёры гістарычнага факультэта займаюцца вызначэннем магіл на сталічных могілках праз вывучэнне біяграфічных звестак дзеячаў ВНУ з асабістых спраў і дакументаў у архіве БДУ і Нацыянальным архіве Беларусі. Таксама гісторыкі працуюць над стварэннем агульнаўніверсітэцкай базы даных супрацоўнікаў, чые надмагіллі маюць патрэбу ў добраўпарадкаванні. Сёння на ўліку ўжо больш за 40 адноўленых пахаванняў, сярод якіх пахаванне Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Каргузалава.

Сцяг універсітэта «скарыў Эльбрус. Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу гістарычнага факультэта Андрэй Максімчык падняўся на самую высокую горную вяршыню Расіі са сцягам БДУ. Свой уздым гісторык прысвяціў стогадоваму юбілею ўніверсітэта. Узыходжанне адбылося 26 жніўня ў складзе групы беларускіх і расійскіх турыстаў-горнікаў.

Прэзентацыя памятнай манеты «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. 100 гадоў» адбылася 8 верасня. БДУ – адзіная ВНУ, ганараваная права валодання памятнай манетай. Яе дызайнерам выступіла мастак Нацыянальнага банка Беларусі Святлана Заскевіч. Адчаканены грашовы знак на Казахстанскім манетным двары. Асабовы бок манеты дэкараваны фірмовым элементам БДУ ў фармаце беларускага арнаменту «васьміног». На адваротным баку нанесены фасад галоўнага корпуса БДУ і лагатып 100-годдзя ВНУ.

Новы стадыён адкрылі 15 верасня на вуліцы Панамарэнкі, 4. Футбольнае поле мае натуральнае пакрыццё. На тэрыторыі размешчаны распранальні, душавыя, пакоі адпачынку для спартсменаў. Тут плануецца правядзенне трэніровак па футболе для студэнтаў БДУ, а ў восеньскі і вясновы навучальныя перыяды – заняткаў па фізічнай культуры для студэнтаў факультэтаў журналістыкі, а таксама філасофіі і сацыяльных навук.

Інтэлектуальна-спартыўны квест «Таямніца папараць-кветкі» сабраў 23 верасня 14 каманд з шасці ўніверсітэтаў, размешчаных на тэрыторыі Студэнцкай вёскі: БДУ, БДЭУ, БДПУ, БНТУ, БДМУ, БДУІР. Яны прайшлі 20 тэматычных пікетаў з заданнямі на эрудыцыю, фізічныя здольнасці і кемлівасць. Студэнты прадэманстравалі свае веды ў галіне гісторыі вышэйшай адукацыі Беларусі, БДУ і сваіх альма-матар.

У рамках веламарафону «100 гарадоў да 100-годдзя ВНУ» на працягу чатырох месяцаў студэнты, выкладчыкі і выпускнікі БДУ правозілі сцяг па розных гарадах і знакавых месцах нашай краіны. Першы маршрут быў пракладзены па гарадзе-герої Мінску і працягнуўся па веладарожкі ўздоўж набярэжнай ракі Свіслач, Нямізі да Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і галоўнага корпуса БДУ. Завяршылася вандраванне сімвала фінальнай перадачай яго кіраўніцтву 30 верасня.

Экскурсійны аўтобус № 100 запусцілі 1 кастрычніка ў Мінску. Гэта акцыя знаёміць жыхароў і гасцей сталіцы з гісторыяй найстарэйшага ўніверсітэта Беларусі, а таксама аб'ядноўвае ўсіх датычных да святкавання 100-гадовага юбілею alma mater. Пазнаць транспарт можна па спецыяльнай таблічцы «100 Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту. Экскурсійны маршрут».

Сцяну партнёраў універсітэта абнавілі ў будынку рэктарата. Яна прызначана для адлюстравання шматграннасці міжнародных дзейнасці беларускай ВНУ і падзякі партнёрам за эфектыўнае супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі. У аснову маштабнага малюнка пакладзена папараць-кветка, сімвал, які ўвасабляе асвету і імкненне да ведаў, а ідэя пераемнасці і міжуніверсітэцкіх сувязяў раскрыта праз вобраз нейрасетак, што аб'ядноўваюць пакаленні розных дзесяцігоддзяў і сусветную ўніверсітэцкую супольнасць. Усяго ў БДУ дзейнічае больш за 500 дамоў з універсітэтамі з 59 краін.

Канверт з арыгінальнай маркай «100 гадоў Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту» выпусціла ў абарачэнне Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі.

У аснове спецштэмпеля – герб Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Спецыяльнае памятное гашэнне адбылося 18 кастрычніка на паштамце Мінска.

Гарадская фотавыстава «100 гадоў БДУ ў гісторыі Беларусі» знаёміць з векавой гісторыяй БДУ. Ва ўрачыстым адкрыцці экспазіцыі 7 кастрычніка ўзялі ўдзел кіраўніцтва, супрацоўнікі і студэнты. У канцэпцыю праекта пакладзена ідэя паказаць праз фотагалерэю станаўленне і сучаснасць першага ўніверсітэта Беларусі. На выставе прадстаўлены тэматычныя стэнды з копіямі больш чым 300 архіўных дакументаў і фатаграфій з калекцыі музея гісторыі БДУ. Здымкі адлюстроўваюць розныя бакі стогадовай дзейнасці ўніверсітэта. Так, экспазіцыя ўключае Дэкрэт аб заснаванні БДУ, дыпломы першых выпускніцы ВНУ, пасведчанне першага рэктара Уладзіміра Пячэты, унікальныя фатаграфіі ўніверсітэцкага дворыка, а таксама асабістыя фота выкладчыкаў і студэнтаў у розныя гады і інш.

Студэнты БДУ пранеслі **Полымя ведаў** праз усе значныя гістарычныя месцы ўніверсітэта ў гонар 100-годдзя БДУ. Стартавай кропкай стаў будынак № 1 БДУ, цяпер гістарычны факультэт, дзе жыў і працаваў першы рэктар У. І. Пячэта. Завяршыўся маршрут ва ўнутраным дворыку БДУ.

Усяго ў эстафеце ўзялі ўдзел больш за 50 студэнтаў усіх факультэтаў і інстытутаў, а таксама навучэнцы Юрыдычнага каледжа і Ліцэя БДУ. Яны прабеглі з сімвалічнай факелам і сцягам БДУ па адмысловым «маршруце часу». Ён ахапіў цэнтральныя вуліцы Мінска і ўключыў месцы, гістарычна звязаныя з падзеямі ўніверсітэта: першыя навучальныя карпусы, бібліятэка, інтэрнаты, сталовая, анатамічны музей і інш. Усяго на карце адзначана 20 знакавых пазіцый. На кожным прыпынку ўдзельнікам распавялі пра малавядомыя факты з хронікі БДУ, якія адлюстроўвалі станаўленне, паступальнае развіццё і рух да сучаснага інавацыйнага ўніверсітэта.

Сімвалічны факел будзе захоўвацца ў музеі гісторыі БДУ, каб будучыя пакаленні змаглі напоўніць яго новым сэнсавым зместам і мэтамі.

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

БДУ адкрыты двойчы

Малавядомыя старонкі гісторыі

Гісторыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пачалася задоўга да яго адкрыцця. У 1831–1832 гг. навучальныя ўстановы Мінскай, Гродзенскай, Віленскай губерняў і Беластоцкай вобласці ўвайшлі ў склад Беларускай навучальнай акругі, а ў 1832 г. быў закрыты Віленскі ўніверсітэт. На тэрыторыі гэтай акругі не засталося ніводнай класічнай вышэйшай навучальнай установы. Прашэнні пра адкрыццё ўніверсітэта паступалі імператару Аляксандру II з Мінска, Віцебска і Магілёва. Прадстаўнік гарадскіх улад Мінска В. В. Янчэўскі ў 1903 г. прапанаваў адкрыць тут універсітэт. Праз 10 гадоў ізноў выступіла з гэтай ідэяй Мінская гарадская дума, але ініцыятыва была адрынута Мікалаем II. У 1917 г. пытанне пра адкрыццё ўніверсітэта ў Мінску разглядалася Часовым урадам. Аргументацыя адмовы была простая: няма сродкаў.

Выкладчыкі БДУ імя У. І. Леніна Героі Савецкага Саюза А. А. Філімонаў, Д. П. Жмуроўскі, А. В. Кірсанаў, М. Я. Зайцаў

Паля Усебеларускага з'езда, які адбыўся ў снежні 1917 г., над праектам стварэння БДУ пачалі працаваць вядомыя навукоўцы-філолагі і гісторыкі. На першапачатковым этапе галоўная роля належала *Я. Ф. Карскаму* і *М. В. Доўнар-Запольскаму*.

У сакавіку 1919 г. газета «Звязда» апублікавала дэкрэт ЦВК ССРБ пра «адкрыццё ў Мінску Дзяржаўнага ўніверсітэта і на першыя, і наяўныя патрэбы для яго арганізацыі вылучэнне са сродкаў рэспублікі 1 млн руб».

У арганізацыі БДУ вялікую ролю сыграў *А. Ф. Мяснікоў*. На нарадзе ў сакавіку 1919 г. ён канстатаваў: «Дзяржаўны універсітэт у Мінску ўжо з'яўляецца фактам. Працуе камісія з сямі асоб пры Губаддзеле народнай адукацыі. Універсітэт неабходны Беларусі па цалым шэрагу меркаванняў эканамічнага, тэхнічнага і культурна-побытавага характару мясцовага жыцця. Адкрыццё ўніверсітэта прызначаецца прымеркаваць да першамайскага свята. Памяшканне для ўніверсітэта ў Мінску знойдзецца. Цэнтр павінен прыйсці на дапамогу сіламі і сродкамі».

Праца па падрыхтоўцы адкрыцця БДУ была спынена польскай акупацыяй горада. Дзейнасць камісіі аднавілася толькі ў лістападзе 1920 г. у Маскве. Яна дала адвесткі пра хуткае адкрыццё ў Мінску ўніверсітэта ў складзе факультэтаў: агранамічнага, медыцынскага, прыродазнаўчага, грамадскіх навук і інстытута беларускай і яўрэйскай культуры.

Пакладзены цвёрды пачатак…

Пастановай калегіі Наркамасветы БССР 8 ліпеня 1921 года было прызначана «Кіраўніцтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў складзе: *праф. У. І. Пічэты, У. М. Ігнатоўскага, М. Я. Фрумкінай і праф. Ф. Ф. Турука*. 5-е месца члена кіраўніцтва ад студэнтаў часова пакінута вакантным. Старшынёй кіраўніцтва і рэктарам універсітэта зацвярджаецца праф. У. І. Пічэта».

Цікавы факт, што БДУ быў адкрыты двойчы – 11 ліпеня і 30 кастрычніка 1921 г.

11 ліпеня ў першую гадавіну вызвалення сталіцы ад польскіх інтэрвентаў, у 9 гадзін вечара ў Мінскім дзяржаўным тэатры адбылася ўрачыстая імпрэза: «Пасля выканання «Інтэрнацыянала» пасяджэнне адкрыў народны камісар асветы БССР *У. М. Ігнатоўскі*. Тэатр быў перапоўнены. Партэр і верхнія ярусы былі запоўнены студэнцтвам, членамі прафсаюзаў, камсамола, слухачамі рабфака, рабочымі і сялянамі. Першымі віталі ўніверсітэт старшыня Саўнаркама і старшыня ЦВК БССР *А. Чарвякоў* і адказны сакратар ЦБ Кампартыі Беларусі *В. Кнорын*. Ад імя прафесуры БДУ выступілі *У. Пічэта, Ф. Турук, М. Андрэеў*. Урачыстасць скончылася ў 2 гадзіны ночы, пакінуўшы ў яго ўдзельнікаў упэўненасць, што справе адкрыцця ў Беларусі вышэйшага рассадніка асветы пакладзены цвёрды пачатак…».

На момант адкрыцця ў БДУ працавалі 14 прафесараў, 49 выкладчыкаў, 10 асістэнтаў і 5 загадчыкаў кабінетаў. Да канца снежня 1921 г. на ўсе факультэты, уключаючы рабочы, было залічана 1124 чалавекі. Першыя ўступныя іспыты для абітурыентаў былі ўведзены толькі праз два гады – у верасні 1923 г.

Першыя прафесары

Для працы ў БДУ рэктар У. І. Пічэта запрасіў з Маскоўскага археалагічнага інстытута ўнікальнага гісторыка-славіста доктара гісторыі *А. М. Ясінскага*, з Данскога ўніверсітэта – вядомага літаратуразнаўца прафесара *І. І. Замоціна*, з Масквы – вучонага сакратара музейнага аддзела Наркамасветы РСФСР лінгвіста і літаратуразнаўца *Я. І. Барычэўскага*.

У 1920-я гг. у БДУ працавалі класікі беларускай літаратуры *Якуб Колас* і *Максім Гарэцкі*, першы старшыня Інстытута беларускай культуры *С. М. Некрашэвіч*, навуковец-гісторык з сусветным імем *М. М. Нікольскі*, вядомы лінгвіст *П. А. Бузук*, гісторыкі *У. М. Перцаў, Д. П. Канчалоўскі, В. Д. Друшчыц*, навукоўцы-педагогі *У. М. Іваноўскі, М. А. Янчук, І. А. Салаўёў*, хімік *Б. М. Бергенгейм*, медык *М. Б. Кроль*, дзяржаўны дзеяч *А. А. Сянкевіч*, аўтар першага падручніка па геаграфіі БССР прафесар *А. А. Смоліч*.

Выпускнікі БДУ канца 1920-х – пачатку 1930-х гадоў з гонарам успаміналі пра свайго выкладчыка ваенна-дапрызыўнай падрыхтоўкі *Г. К. Жукава*, запрошанага на працу ва ўніверсітэт рэктарам У. І. Пічэтам.

У фондах Нацыянальнага архіва Беларусі захоўваецца рэкамендацыя аўтара тэорыі рэлятыўнасці лаўрэата Нобелеўскай прэміі *Альберта Эйнштэйна* свайму вучню – выхадцу горада Брэст-Літоўска *Я. П. Громеру*, адрасаваная кіраўніцтву БДУ, з просьбай залічыць яго на пасаду прафесара. Аўтарытэтны ліст паспрыяў уладкаванню Я. П. Громера ў 1928 г. на кафедру матэматыкі БДУ. Ён прыехаў з Берліна, дзе працаваў у Фізічным інстытуце, у Мінск на пастаянную працу.

Напярэдадні прыходу да ўлады нацыстаў Альберт Эйнштэйн звярнуўся да кіраўніцтва БССР з просьбай пра пераезд у Мінск і працаўладкаванне ў Беларускай акадэміі навук і Беларускім дзяржаўным універсітэце, але яму было адмоўлена. І тады ў 1933 г. Эйнштэйн эміграваў у ЗША.

Сярод выкладчыкаў БДУ былі Героі Савецкага Саюза: начальнік ваеннай кафедры генерал-маёр *А. В. Кірсанаў*, дактары гістарычных навук *Д. П. Жмуроўскі, А. А. Філімонаў* і дацэнт *М. Я. Зайцаў*.

20 лютага 1925 г. адбыўся першы выпуск факультэта грамадскіх навук. Універсітэт пакідалі 34 эканамісты і 26 юрыстаў. У маі першых спецыялістаў выпусцілі педагагічны і медыцынскі факультэты.

Славутыя выпускнікі

30 кастрычніка 1926 г. *У. І. Пічэту* было прысвоена ганаровае званне заслужанага прафесара БССР. Ён стаў першым (і адзіным) у Беларусі ўладальнікам гэтага звання.

Самым знакамітым выпускніком медфака 1926 г. стаў выхадзец з Ігумена (Чэрвеня), навуковец-анатам, эмбрыёлаг, заснавальнік нейрамарфалагічнай беларускай школы, медык з еўрапейскім імем, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР *Д. М. Голуб*. Ён у 1946–1975 гг. працаваў у Мінскім медыцынскім інстытуце, у тым ліку загадчыкам кафедры анатоміі, а потым – у Інстытуце фізіялогіі НАН Беларусі.



Акадэмік Л. А. Арцымовіч



Генерал Я. У. Смушкевіч

Прыгадаем таксама выпускніка БДУ *Л. А. Арцымовіча*, унікальнага навукоўца-фізіка, акадэміка АН СССР, члена прэзідыума АН СССР, акадэміка-сакратара Аддзялення агульнай фізікі і астраноміі АН СССР. У 1928 г., 19-гадовым юнаком, ён скончыў фізіка-матэматычны факультэт БДУ. Ён праславіўся даследаваннямі ў галіне атамнай і ядзернай фізікі, электроннай оптыкі, фізікі плазмы. Пад кіраўніцтвам Л. А. Арцымовіча ўпершыню ў СССР распрацаваны электрамагнітны метад падзелу ізатопаў. Менавіта Леў Андрэевіч быў непасрэдным удзельнікам распрацоўкі савецкага атамнага праекта і адкрыцця цвёрдага выпраменьвання імпульснага разраду. Ён упершыню ажыццявіў (разам з супрацоўнікамі) фізічную тэрмаядзерную рэакцыю ва ўстойлівай квазістацыянарнай плазме. Яго імем названы кратар на Месяцы, цеплаход, вуліца ў Маскве. Заснаваны імянныя стыпендыі для выдатнікаў МДУ імя М. В. Ламаносава.

У 1950 г. выпускніком БДУ стаў яшчэ адзін таленавіты фізік – *М. А. Барысевіч*, вядомы сваімі даследаваннямі па люмінесцэнцыі і спектраскапіі складаных малекул, квантавай электронікі і інфрачырвонай тэхнікі. 18 гадоў ён узначальваў Акадэмію навук Беларусі. Мікалай Аляксандравіч быў дзейсным членам АН СССР, Расійскай акадэміі навук, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР.

Выпускніком філасофскага аддзялення БДУ 1955 г. стаў вядомы грамадазнавец, аўтар звыш 1000 навуковых прац, акадэмік, ганаровы дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі *Я. М. Бабосаў*.

У 1956 г. філасофскае аддзяленне БДУ скончыў сусветна вядомы навуковец-філосаф і культуролаг, акадэмік РАН, дырэктар Інстытута філасофіі РАН *В. С. Сцёпін*. У 1974–1987 гг. ён працаваў ва ўніверсітэце.

Сярод выпускнікоў БДУ 1961 г. быў сусветна вядомы навуковец-матэматык, акадэмік Расійскай акадэміі навук, прэзідэнт АН Беларусі (1987–1992), заслужаны дзеяч навукі БССР *У. П. Платонаў*, які працаваў у Інстытуце перспектыўных даследаванняў (Прынстан, ЗША). Зараз ён жыве ў Расіі.

У 1962 г. БДУ скончыў фізік-тэарэтык з сусветным імем *У. Р. Барышэўскі*. Ён стварыў новую галіну фізічных даследаванняў – ядзерную оптыку палярызаваных асяроддзяў, у якой зрабіў два адкрыцці. У 1986 г. ён стаў дырэктарам НДІ ядзерных праблем.

Калектыў выкладчыкаў і студэнтаў БДУ ганарыцца сваімі выпускнікамі – класікамі беларускай літаратуры, народнымі пісьменнікамі Беларусі *Кандратам Крапівой, Іванам Мележам, Іванам Навуменкам* і *Іванам Чыгрынавым*, народнымі паэтамі Беларусі *Петрусём Броўкам, Нілам Гілевічам* і *Рыгорам Барадуліным*, а таксама *Алесем Адамовічам, Паўлюком Трусам, Язэпам Пушчам, Генадзем Бураўкіным, Алегам Лойкам, Уладзімірам Карызнам*.

У гады Вялікай Айчыннай вайны 12 супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ былі ганараваны звання Героя Савецкага Саюза. Некаторыя былыя студэнты БДУ сталі таленавітымі военачальнікамі. Выпускнік сацыяльна-эканамічнага аддзялення педагагічнага факультэта БДУ *Я. У. Смушкевіч* пад імем «генерал Дуглас» стаў старшым саветнікам пры камандуючым ваенна-паветранымі сіламі рэспубліканскай Іспаніі, камандзірам авіяцыйнай групы савецкіх лётчыкаў. 17 лістапада 1939 г. трэцім у СССР ён стаў двойчы Героем Савецкага Саюза. А праз два дні герой Халхін-Гола быў прызначаны начальнікам Ваенна-паветраных сіл РККА. У жніўні 1940 г. Я. У. Смушкевіч стаў генерал-інспектарам ВПС Чырвонай арміі, а ў снежні таго ж года – памочнікам начальніка Генеральнага штаба па авіяцыі. У 1941 г. ён быў рэпрэсаваны. Імем Якава Смушкевіча названы карабель, а таксама адна з вуліц Віцебска. Пра военачальніка зняты дакументальны фільм, напісана некалькі кніг.

Пра ўсіх знакамітых выпускнікоў БДУ не распавядзеш. Але і названых імёнаў дастаткова, каб пераканацца: 100 гадоў пражыта нездарма. Цяперашнім студэнтам ёсць з каго браць прыклад.

Эмануіл ІОФЭ,
прафесар, доктар гістарычных навук,
выпускнік гістарычнага факультэта
БДУ 1961 года

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

Інтэрнат – свет у мініяцюры!

БДУ – адзіная ВНУ нашай краіны, у якой усе інтэрнаты для іншагародніх студэнтаў капітальна адрамантаваны або пабудаваны ўжо ў суверэннай Беларусі. Ёсць і іншая нагода для гонару: у БДУ раней за іншыя ўніверсітэты з'явіўся свой студгарадок і першы музей студэнцкіх інтэрнатаў.

Студэнты рабфака БДУ ў інтэрнаце. 1927 г.

У студэнцкім пакоі. 1980-я гг.

Жыхары студгарадка. 2021 г.

Першыя студэнты жылі ў навучальных карпусах і доме адпачынку: як усё пачыналася (1921–1952 гады)

Днём нараджэння нашага студгарадка прынята лічыць 6 верасня 1974 г., калі зацвердзілі яго штат у асобе дырэктара, намесніка па палітыка-выхаваўчай рабоце, начальніка службы эксплуатацыі будынкаў, старшага бухгалтара, інжынера, старшага інспектара па засяленні, загадчыка склада і інструктара па супрацьпажарнай бяспецы. Цяпер у студгарадку працуюць 422 работнікі.

Але гісторыя студэнцкіх інтэрнатаў пачалася значна раней. БДУ адкрыўся ў 1921 г., і студэнтам трэба было дзесьці жыць. Ім давалі месцы ў доме адпачынку і іншых грамадскіх будынках. Ёсць звесткі, што ў 20–30-х гадах многія студэнты жылі там, дзе і вучыліся. Тады ў будынку рэктарата прахадзілі заняткі рабочага факультэта, грамадскіх навук і медыцынскага. Навучэнцы расстаўлялі там ложкі і начавалі. Студэнты самі нарыхтоўвалі дровы для прагрэву памяшканняў, сачылі за парадкам і дысцыплінай.

Вядома, што 30 верасня 1923 г. прэзідыум ЦВК Беларусі вылучыў 30 тысяч залатых рублёў на пабудову інтэрната для выкладчыкаў універсітэта.

У «Правілах унутранага распарадку ў інтэрнатах БДУ» 1926 г. узгадваюцца вельмі незвычайныя для нашага часу побытавыя звычкі. Студэнты мусілі наведваць лазню не меней за два разы на месяц, пасля гадзіны ночы нельга было знаходзіцца ў інтэрнаце чужым людзям, забаранялася выліваць памыі ў канавы ля дзвярэй і выкідваць смецце ў вокны. У гадзіну ночы зачыняліся дзверы і тушылі святло рубільнікам.

Тады студэнтам даводзілася жыць часам нават у экстрэмальных умовах. Некаторыя памяшканні дрэнна ацяпляліся, асвятленне было вельмі слабым, у пакоях жылі па некалькі дзясяткаў чалавек, з мэбляй былі праблемы, часам бракавала коўдраў. Здаралася, што студэнты не маглі паехаць на заняткі, бо ім апрануць не было чаго.

Выдавалі насценгазеты, ладзілі вяселлі ў інтэрнатах: пра будаўніцтва студгарадка (1952 – пачатак 2000-х гадоў)

Умовы пражывання студэнтаў паступова паляпшаліся ў павоенны час. Інтэрнат пад нумарам 1 на 500 месцаў адкрылі 7 лістапада 1952 г. па вуліцы Свярдлова, 34. Ён дзейнічае і цяпер – студэнты называюць яго «капейка». Яна нейкі час лічылася найгоршым інтэрнатам. За два гады там змянялася 12 камендантаў. Але пасля таго, як туды засялялі студэнты гістарычнага факультэта, сітуацыя палепшылася. Гісторыкі патрабавальна ставіліся да парадку. Яны выдавалі насценгазету «Калючка», у якой крытыкавалі нават драбнюткія парушэнні дысцыпліны, рэгулярна праводзілі конкурсы «Найлепшы пакой інтэрната», «Найлепшае навагодняе ўпрыгожванне». Інтэрнат № 1 заняў першае месца ва ўніверсітэцкім аглядзе ўжо ў першы год засялення гісторыкаў.

У лютым 1953 г. пачалося будаўніцтва двух інтэрнатаў на вуліцы Бабруйскай. Цяпер там адміністрацыйныя службы. У жніўні 1954 г. засялілася яшчэ 400 студэнтаў, а ўжо ў маі 1956 г. БДУ меў пяць сваіх інтэрнатаў, у якіх пражывалі 1060 студэнтаў.

У ліпені 1958 г. пачалося будаўніцтва студэнцкага інтэрната № 5 на 800 месцаў па вуліцы Кастрычніцкай, 4. Цікавы факт: кожны студэнт адпрацаваў на будоўлі па чатыры гадзіны, а падчас летніх вакацый абавязаўся адпрацаваць не менш за 10 дзён. У новыя два карпусы жыхары засяліліся ў лістападзе 1963 г. Пакоі былі разлічаны на пяць чалавек. Цяпер у адным з карпусоў размяшчаецца адміністрацыя студгарадка, псіхалагічная служба і ваенны факультэт.

Студэнты таксама бралі актыўны ўдзел у будаўніцтве інтэрната № 4 па праспекце Машэрава, 9 (тады вуліца Паркавая) на 651 месца. Ён быў заселены ў верасні 1960 г. і стаў адным з самых шматлюдных інтэрнатаў БДУ, дзе пражывала да 1100 студэнтаў філфака, біяфака, юрфака і журфака. Ён вядомы тым, што ў яго сценах праводзіліся вяселлі і актыўна ствараліся сем'і.

У 1968 г. быў здадзены студэнцкі інтэрнат № 6 па вуліцы Кастрычніцкай, 10. Там пражывалі студэнты хімічнага і матэматычнага факультэтаў. Да 1969 г. ва ўсіх інтэрнатах БДУ былі ўладкаваны ленінскія пакоі і чытальныя залы, выпускаліся насценгазеты. У некаторых інтэрнатах узнагароджвалі пераходным вымпелам. А ў інтэрнаце № 5 пераможцам конкурсу на найлепшы пакой давалі вельмі каштоўны прыз – радыёлу «Мінск-6». Студэнты ладзілі вечары, лекцыі, канцэрты.

30 снежня 2020 г. быў адкрыты музей Студэнцкага гарадка БДУ – гэта першы ў Беларусі музей студэнцкіх інтэрнатаў. Экспазіцыя музея ўвесь час папаўняецца і дае магчымасць даведацца пра этапы станаўлення студгарадка, адчуць дух студэнцкага жыцця розных эпох.

У верасні 1971 г. быў заселены новы студэнцкі інтэрнат № 7 на 1200 месцаў па вуліцы Кастрычніцкая, 10 а, а ў 1975 г. адчыніліся інтэрнат № 3 на 1098 месцаў па вуліцы Курчатава, 6 і 13-павярховы інтэрнат № 2 па вуліцы Кастрычніцкая, 2.

У1981 г. у інтэрнатах БДУ пражывалі 4912 студэнтаў – 69 % ад агульнай колькасці іншагародніх навучэнцаў дзённага аддзялення. Былі і такія часы ў 80-х, калі месцаў у інтэрнатах было больш, чым іншагародніх студэнтаў: у БДУ тады праталася шмат сталічных хызарэў.

У верасні 1985 г. быў заселены новы інтэрнат № 8 на 363 месцы па вуліцы Краснаармейнага, 51. У 1998 г. яго перавялі ў разрад маласямейнага. У 1992 г. БДУ перадаліў будынак па вуліцы Карла Маркса, 24, у якім да 2010 г. знаходзіўся інтэрнат № 9. У верасні 1998 г. студэнты засяліліся ў новы інтэрнат № 10 квартэрнага тыпу на 1000 месцаў па вуліцы Курчатава, 8.

Умовы паляпшаюцца: пра адкрыццё сучасных інтэрнатаў і мадэрнізацыю старых

Студгарадок пачаў праводзіць капітальныя рамонты інтэрнатаў з 1994 г., і за гэты час адрамантаваны ўсе шэсць інтэрнатаў, пабудаваных у мінулым стагоддзі. Яны былі калідорнага тыпу. Цяпер мадэрнізаваны, як, напрыклад, інтэрнат № 1.

У чэрвені 2008 г. адбылася закладка капсулы ў падмурак Студэнцкай вёскі з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, першым будынкам у ёй стаў інтэрнат БДУ. Ужо 19 студзеня 2010 г. адкрыўся інтэрнат № 11 БДУ на праспекце Дзяржынскага, 87.

Праз тры гады адкрыўся яшчэ адзін інтэрнат БДУ № 4 квартэрнага тыпу на вуліцы Чурлёніса, 7.

Цяпер на балансе студгарадка знаходзяцца 10 інтэрнатаў, адзін з якіх прадугляджаны для работнікаў універсітэта. Усяго ў іх пражывае больш за 8 тысяч студэнтаў і больш за 350 супрацоўнікаў БДУ і іх сем'яў.

Кожны з нашых інтэрнатаў камфортны і добраўпарадкаваны. Калі раней студэнтам даводзілася перавозіць мноства рэчаў, каб арганізаваць свой побыт, то сёння яны могуць абмежавацца адным чамаданам з адзеннем і прадметамі гігіены. З кожным годам матэрыяльна-тэхнічная база пашыраецца: ва ўсіх інтэрнатах ёсць пральні, працуюць пункты абмену бялізны. Калі раней халадзільнікі былі вялікай раскошай і многім студэнтам даводзілася прывозіць іх з дому ці арандаваць, то цяпер неабходнай тэхнікай забяспечаны ўсе інтэрнаты, за выключэннем «дзясяткі».

Адміністрацыя студгарадка пяць гадоў таму запланавала зрабіць цеплавую мадэрнізацыю інтэрнатаў № 6 і № 10: памянялі вокны і ўцяпляць будынкі. І да юбілею справілася з гэтай задачай. Сёлета стаяць ужо новыя грандыёзныя мэты: капітальны рамонт у інтэрнаце № 10, якому ўжо больш за 20 гадоў. Пачатак пакладзены: у пакоях ужо цёпла. А далей трэба рэканструяваць пакоі, зрабіць касметычны рамонт. Ёсць і яшчэ адна адказная задача на найбліжэйшыя 5–10 гадоў: пакоўкі ў БДУ пакуль не 100 % іншагародніх студэнтаў забяспечаны месцамі, нашаму ўніверсітэту гарадскія ўлады паабяцалі пабудаваць яшчэ адзін інтэрнат на 1030 месцаў. Пад будынак ужо вызначана пляцоўка за МКАД па вуліцы Курчатава паміж інтэрнатам № 3 і біялагічным факультэтам. Верагодна, працэс будаўніцтва пачнецца ў 2025 годзе.

Студэнты, якія пражываюць у інтэрнатах, маюць мноства магчымасцяў для актыўнага ўдзелу ў грамадскім і культурным жыцці як студэнцкага гарадка, так і ўніверсітэта ўвогуле. Штогод у інтэрнатах праходзяць больш за 200 культурна-масавых, спартыўных і выхаваўчых мерапрыемстваў з лікам удзельнікаў звыш 14 тысяч чалавек.

Традыцыйнымі сталі кулінарны конкурс, конкурс студэнцкай песні «Сярэбраныя струны», шоў-конкурсы «Супермен», «Міс Вясна», «Зорная пара», «Брэйн-рынг», «Што? Дзе? Калі?», міжуніверсітэцкі фэст нацыянальных культур.

Папулярнасцю карыстаецца круглагадовая спартакіяда інтэрнатаў БДУ, дзе зборныя каманды спаборнічаюць у розных відах спорту: армрэстлінгу, стрытболе, валейболе, лёгкай атлетыцы, міні-футболе, настольным тэнісе, перацягванні каната, плаванні, шахматах.

УНІВЕРСІТЭТ
27 кастрычніка 2021 года, № 12 (2249)

За апошнія 4 гады БДУ больш чым у тры разы павялічыў уласныя ўкладанні, а таксама атрымлівае значную фінансавую дапамогу ад дзяржавы на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, рэканструкцыю дзейных карпусоў і будаўніцтва новых. Разам з рэалізацыяй глабальных праектаў паляпшаюцца карпусы факультэтаў і інтэрнатаў: праводзяцца рамонты, абнаўляецца мэбля і абсталяванне. На пяцігодку ў адміністрацыі маштабныя планы.

Вялікія будоўлі і маштабныя рэканструкцыі БДУ

Новае аблічча галоўнага корпуса

Рэканструкцыя галоўнага корпуса БДУ пачалася ў 2001 г. Быў абноўлены фасад і праведзены рамонт часткі корпуса фізічнага факультэта. Потым больш за 15 гадоў працы былі замарожаныя. Рэканструкцыя другой чаргі галоўнага корпуса на прасп. Незалежнасці ўзнавілася ў 2020 г. Гэты будынак з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі, таму ўсе працы праводзяцца пад навуковым кіраўніцтвам і па ўзгадненні з Міністэрствам культуры. Асноўная задача – захаваць максімум дэталяў і аўтэнтычнасць будынка 1961 года: дубовыя дзверы, знешняе аблічча вокнаў, каванне лесвіц і нават абшыўку фасада з дадаткам слюды. Падчас рэканструкцыі з галоўнага корпуса прыбралі спартзалу. На яе месцы абсталявалі некалькі новых аўдыторый.

У абноўлены будынак перамесціцца ўвесь цэнтральны камунікацыйны вузел універсітэта, які ўключае і цэнтр апрацоўкі даных, і сістэму відэаканферэнцсувязі, і тэлефанію. У корпусе з'явіцца поўнае пакрыццё Wi-Fi, новая сістэма відэаназірання, якая можа быць задзейнічана ў адукацыйным працэсе. Цалкам будуць абноўлены санвузлы, дзверы і заменены падлогавыя пакрыцці, закуплена новая мэбля і часткова лабараторнае абсталяванне для студэнтаў. Усе працы другой чаргі плануюць завяршыць у наступным годзе. На рэканструкцыю вылучана больш за 40 млн рублёў з бюджэту.

Трэцяя чарга – плошчы ММФ і ФПМІ, што засталіся. Чацвёртая чарга рэканструкцыі галоўнага корпуса мяркуе абнаўленне плошчаў актавай залы і бібліятэкі. На гэта вылучаць больш за 50 млн рублёў. Працы плануюць пачаць ужо напачатку 2023 г.

Аўдыторыя факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі

Абноўлены музей землязнаўства

Дызайн-праект корпуса-музея гістарычнага факультэта

Адкрыццё новага стадыёна БДУ на вул. Панамарэнкі

Уладкаванне ўнутранага дворыка

Унутраны дворык БДУ таксама занесены ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Апошні раз капітальны рамонт на яго тэрыторыі праводзіўся ў 1995–1996 гг. Сёлета тут таксама адбываліся вялікія будаўнічыя пераўтварэнні. Зараз гэта славутасць БДУ стала цалкам даступнай – афармлена безбар'ернае асяроддзе як для тых, хто слаба бачыць, так і для людзей з парушэннямі апорна-рухальнага апарата. Разам з пракладкай новых камунікацый у дворыку абнавілі плітку. Запланавана ўсталяванне лавак, урнаў і велапарковак у адзіным архітэктурным стылі. Дызайнеры надалі ўвагу нават самым дробным дэталям. Напрыклад, тут абновяць усе люкі, на якіх з'явяцца элементы фірмовага стылю БДУ.

На тэрыторыі дворыка ўсталююць амфітэатр на 160 месцаў, адкрыць яго плануюць да вясны. Студэнты змогуць праводзіць масавыя мерапрыемствы на свежым паветры. З'явіцца недалёка ад галоўнага корпуса і вялікая пергола. Завершацца працы ва ўнутраным дворыку абнаўленнем ландшафтнага дызайну. Ужо бліжэй да лета гэты ўніверсітэцкі куток стане адным з самых прыцягальных месцаў для прагулак пад адкрытым небам.

Рэканструкцыя будынка факультэта-музея гістфака

Ужо цяпер гістарычны факультэт часова змяняе прапіску і пераязджае на Мендзялеева, 36 у былы корпус БДЭУ, які неўзабаве пяройдзе ва ўласнасць БДУ. У будынку гістфака на Чырвонаармейскай, 6 пачнецца глабальная мадэрнізацыя. З бюджэту на гэта вылучаць 9 млн рублёў. Унутраны інтэр'ер плануюць кардынальна абнавіць на працягу 2022 г. Зменіцца і сама канцэпцыя будынка – кожны яго паверх стане часткай вялікага музея. Ужо цяпер пачынаецца рэстаўрацыя. На калідорах з'явяцца стэнды з тэматычнымі экспазіцыямі. Узновяць аўдыторыю першага рэктара Уладзіміра Іванавіча Пічэты, у ёй будзе адноўлены фрагмент рэктарскага кабінета.

Новыя карпусы на Даўгабродскай і Курчатава

БДУ працягвае пашыраць плошчы. Увесці ў эксплуатацыю новы сямі-павярховы будынак на вуліцы Даўгабродскай на 18 тыс. м² плануюць сёлета. Два паверхі зойме МДЭІ імя А. Д. Сахарава, на астатніх паселяцца філалагічны і эканамічны факультэты. Адкрыецца корпус у пачатку другога семестра.

У планах адміністрацыі БДУ і ўладкаванне новага корпуса міждысцыплінарнага цэнтра прыродазнаўчай адукацыі на Курчатава, 7 за кошт крэдытавання Сусветнага банка. Увесці яго ў эксплуатацыю плануюць у 2025 г.

Супрацоўніцтва са спонсарамі і лакальныя праекты

Дапамагаюць абнаўляць матэрыяльна-тэхнічную базу БДУ і спонсары. Напрыклад, да 100-годдзя ўніверсітэта на факультэце журналістыкі адкрыты беларуска-кітайскі медыяцэнтр дзякуючы матэрыяльнай падтрымцы з боку кітайскіх партнёраў. Белінвестбанк вылучыў сродкі на абнаўленне воблачнага сховішча БДУ. Актыўна падтрымліваюць alma mater і IT-кампаніі. Яны дапамагаюць з закупкай абсталявання, камп'ютараў, аплачваюць удзел студэнтаў у розных конкурсах і падтрымліваюць лакальныя праекты на факультэтах. БДУ становіцца больш сучасным і тэхналагічным.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 25.10 .2021 г.
Зак. 1088. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by